На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

**№№23–24**
**(2543–2544)**
9 лютага 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.


**Да ўвагі!**

***Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!***

## Наведвайце сайт «Народнай волі»!

Паважаныя чытачы "Народнай волі"!
Знайсці нас у Інтэрнеце можна па адрасе **www.nv-online.info**
Там вы зможаце прачытаць артыкулы апошніх нумароў газеты і абмеркаваць іх, давадацца пра падзеі ў краіне і свеце на стужцы навін, напісаць электронны ліст у рэдакцыю.
Архіў газеты можна паглядзець па адрасе **http://nv.promedia.by**

**ПОДСЧИТАЛИ**

## *Село вновь просит денег на посевную*

**В связи с новыми ценами на горюче-смазочные материалы белорусским сельхозпредприятиям не хватает на посевную 70 миллионов долларов. Минсельхозпрод ходатайствует перед Александром Лукашенко о выделении соответствующего денежного займа.**

Как сообщил заместитель министра сельского хозяйства Василий Павловский, проект соответствующего распоряжения Александра Лукашенко уже подготовлен.

Всего для проведения весенних полевых работ хозяйствам страны необходимо 187 тысяч тонн дизельного топлива и 38 тысяч тонн автомобильного бензина. На начало февраля в сельскохозяйственных организациях запас составлял крохи — только 6,2 тысячи тонн дизтоплива и 1,8 тысячи тонн бензина.

*"Если в прошлом году тонна дизельного топлива стоила 970 тысяч рублей, то в нынешнем году в связи с повышением цен на энергоресурсы — 1,5 миллиона. Таким образом, нефтепродукты для села подорожали почти в 1,5 раза",* — отметил Василий Павловский в беседе с журналистами.

По его словам, сложность заключается также в том, что льготных цен на дизельное топливо для сельскохозяйственных организаций страны в нынешнюю посевную не будет. Топливо будет приобретаться по договорным ценам. И с учетом новых цен на нефтепродукты хозяйствам потребуется 420 миллиардов белорусских рублей. Дефицит средств на сегодняшний день составляет 298 миллиардов рублей.

**Лилия ВОРОНОВА.**



**ТЕМА ДНЯ**

*Вячеслав ОРГИШ,*
*доктор философских наук*

# Куда идешь?

*или О том, как обстоят дела с новой стратегией белорусской власти*

Весь январь Александр Лукашенко и министры белорусского правительства лихорадочно искали решение проблем, которые навалились в результате белорусско-российского нефтегазового конфликта. Едва ли не впервые белорусский правитель, хоть и нехотя (сквозь зубы), заговорил об ошибках своей стратегии, а также о том, что белорусское общество не хочет "оголтело" бежать в Россию. И непривычно откровенно звучала из его уст мысль о том, что надо "срочно" диверсифицировать внешние отношения — развивать западный вектор белорусской политики.

### Нехорошо прятать негатив

На протяжении последней январской декады белорусский руководитель аж пять раз озвучивал свои взгляды на сложившуюся после нефтегазового конфликта щекотливую ситуацию. 22 января — в интервью немецкой газете "Вельт ам Зоннтаг", 23 января — в ходе совещания с руководством ОАО "Нафтан", 26 января — на церемонии вручения дипломов доктора наук и аттестатов профессора научным и научно-педагогическим работникам, 30 января — в беседе с лидером КПРФ Геннадием Зюгановым, 31 января — в беседе с известным великодержавником писателем Александром Прохановым.

Выступая перед ученой аудиторией, белорусский лидер был особенно (как никогда ранее) самокритичен и откровенен. *"Наверное, моя ошибка в том, что я 7—8 лет, а может, 10 лет тому назад, когда мы после референдума начали движение навстречу с Российской Федерацией, к Союзу, прятал тот негатив, который был в отношениях с Россией".* Обмениваясь мнениями с главным российским коммунистом, Александр Григорьевич не выдержал и выдал-таки тайну. Оказывается, российские противники интеграции пачкают его образ самым низменным веществом. Из-за этого *"воняет с Москвы уже до Минска".*

Такова сермяжная правда Александра Лукашенко. Но есть и другая правда, более суровая и нелицеприятная. Согласно этой правде, стремление белорусов слиться в интеграционном экстазе с россиянами было всегда сильно преувеличено. Александр Лукашенко, руководствуясь соображениями собственной политической выгоды, волюнтаристски толкал Беларусь в объятия России. Более или менее объективные социологические исследования всегда показывали, что политического объединения с Россией желало меньшинство (примерно четверть респондентов). Большинство поддерживало (и то не всегда) лишь экономическую интеграцию (о чем лично мне и многим другим авторам приходилось писать неоднократно). Но белорусская государственная пропаганда систематически подменяла понятия и представляла дело таким образом, что белорусы только и мечтают о том, чтобы жить в едином государстве с россиянами.

Слава Богу, до белорусского руководителя, хоть и с большим опозданием, хоть и с потерями для национального развития, наконец доходит (хочется верить — доходит), что *"не можем мы раствориться даже в братской России, внутри этого государства. Не можем мы потерять свою землю. Не можем".* Сразу как-то даже трудно поверить в то, что растратчик белорусского суверенитета сделался его горячим защитником. Очень может быть, что метаморфоза носит ситуативный характер, продиктована тактическими соображениями. Крах откровенно пророссийской политической стратегии ставит Александра Лукашенко перед необходимостью защищаться и маневрировать, искать удачи даже в Брюсселе.

Однако сегодня важно и принципиально другое. Как приживется и насколько будет успешной альтернативная стратегия, ориентированная на западный вектор социокультурного развития белорусского общества? Признаваясь в ошибках, в провале интеграции, белорусский руководитель, естественно, не мог в своих выступлениях обойти стороной тему возможного стратегического поворота. Тему очень болезненную для его автократического самолюбия, поскольку уже само ее публичное обсуждение развенчивает миф о "батьке" Лукашенко как "мудром" начальнике белорусов.

### Даешь западных инвесторов!

Тем не менее цены на газ и нефть, которые Москва одним махом приблизила к рыночным, сделали то, чего белорусская оппозиция не смогла добиться за многие годы противостояния режиму. Александр Лукашенко уже почти готов идти (хоть и нехотя) впереди процесса укрепления белорусского суверенитета. И, вполне вероятно, если Кремль не отойдет от рыночных методов "воспитания" минского клиента, может наступить время, когда у него прорежется готовность возглавить новый стратегический курс. Выступая перед учеными в ВАКе, беседуя с Зюгановым, Прохановым, белорусский руководитель подсознательно испытывал некоторую неловкость оттого, что, вопреки многолетней политике, нынче вынужден смотреть в сторону западных берегов, хотя "хорошо знает", как его воспринимают на Западе. Поэтому риторика Александра Григорьевича частично была сосредоточена на том, чтобы убедить публику, будто ничего нового в его политических намерениях и установках нет. *"...Меня уже начинают сталкивать куда-то там к американцам и так далее. Мы кардинально не собираемся менять никакого курса. Мы во внешней политике, я надеюсь, нашли тот путь, единственный, который возможен для нашей страны. Мы в центре Европы. Мы должны нормально жить и с Востоком, и с Западом".*

Что на это возразить? Во времена безоглядного братания с Москвой Александр Григорьевич не уставал подчеркивать, что Беларусь — западный форпост России, который надежно прикрывает ее от натовских ракет и прочее и прочее. По этой причине его заверение в том, что белорусская внешняя политика "всегда была" многовекторной, мягко говоря, сильно отдает лукавством. Как и признание в том, что в угоду России *"мы какое-то время летели на одном крыле. Не по нашей вине испортились у нас отношения с Западом".* На одном крыле (пророссийском) Лукашенко летел весь период своего правления, а отношения с Западом начали портиться еще тогда, когда белорусский президент изгнал западный дипломатический корпус из Дроздов.

*(Окончание на 2-й стр.)*

**ПАДРАБЯЗНАСЦІ**

## *Жанчына супраць генерала*

21 лютага ў судзе Фрунзенскага раёна Мінска пачнецца судовы працэс па іску сябра Сойма Партыі БНФ Валянціны Свяцкай да былога міністра ўнутраных спраў генерала Юрыя Сівакова. Жанчына патрабуе спагнаць з міліцэйскага генерала 60 мільёнаў рублёў за маральныя страты, нанесеныя публікацыяй Юрыя Сівакова "Пра гонар".

Яшчэ ў верасні 2006 года Валянціна Свяцкая накіравала ў суд Фрунзенскага раёна Мінска іск аб абароне гонару і годнасці да Юрыя Сівакова і Беларускай асацыяцыі ветэранаў спецпадраздзяленняў войскаў МУС "Гонар", якую генерал узначальваў.

Артыкул Юрыя Сівакова "Пра гонар", апублікаваны ў чацвёртым нумары часопіса "Спецназ", Валянціна Свяцкая расцаніла як абразу гонару і годнасці. Юрый Сівакоў цытуе кодэкс нямецкага афіцэра, напісанага Адольфам Гітлерам. "Пры ўсёй адыёзнасці гэтай асобы над многімі пастулатамі, якія ён дэкларуе, ёсць сэнс задумацца", — піша Ю.Сівакоў.

Ад моманту падачы іску да прыняцця яго да разгляду прайшло роўна шэсць месяцаў. Напачатку суд Фрунзенскага раёна адмаўляўся прымаць іск да разгляду па самых розных прычынах: то няправільна аформленыя дакументы, то не ўплачана 100% пошліны (хаця спачатку плаціцца 50% і 50% — перад пачаткам працэсу), то адсутнічае адрас пастаяннага месца жыхарства адказчыка — Юрыя Сівакова. Што да апошняга, то суд мог гэта ўстанавіць самастойна, запатрабаваўшы адпаведныя дакументы ці з Мінюста, дзе зарэгістравана Беларуская асацыяцыя ветэранаў спецпадраздзяленняў войскаў МУС "Гонар", ці з рэдакцыі часопіса "Спецназ", які апублікаваў матэрыял.

У рэшце рэшт цярпенне Валянціны Свяцкай лопнула, і яна падала прыватную скаргу на адмову Фрунзенскага суда ў Мінскі гарадскі суд. 5 лютага жанчына атрымала павестку з'явіцца на папярэднія слуханні па справе ў суд Фрунзенскага раёна 21 лютага.

*"Наколькі я ведаю, зараз Юрый Сівакоў ужо не з'яўляецца кіраўніком Беларускай асацыяцыі ветэранаў спецпадраздзяленняў войскаў МУС "Гонар". Але я не змяню сваё стаўленне да публікацыі — незалежна ад таго, кіруе ён асацыяцыяй ці не. Прагнозы адносна выніку вельмі і вельмі песімістычныя. На працягу шасці месяцаў Фрунзенскі суд не мог вызначыцца са справай. Хаця, калі шчыра казаць, я не чакала, што суд прыме іск да разгляду ўвогуле",* — падсумавала Валянціна Свяцкая.

**Глеб ХМЯЛЬНІЦКІ.**

**ВАНДАЛЫ**

## *Лава сутыкнення*

**Пасольства ЗША ў Беларусі выказвае шкадаванне ў сувязі з разбурэннем у Курапатах "лаўкі Клінтана", паведаміў прадстаўнік прэс-службы дыпмісіі Аляксей Саламаха.**

*"Пасольства шкадуе, што зноў была разбурана мемарыяльная лаўка — падарунак беларускаму народу ад народа ЗША,* — сказаў А.Саламаха. *— Але яшчэ большую занепакоенасць выклікае тое, што гэты факт вандалізму зневажае памяць тысячы ахвяраў сталінізму ў Курапатах. Пасольства збіраецца і ў далейшым шанаваць памяць тых, хто загінуў у Курапатах".*

Паводле слоў прадстаўніка прэс-службы, пасольства ЗША разглядае *"некалькі варыянтаў абнаўлення мемарыяльнай лаўкі".*

На мінулым тыдні невядомыя вандалы разбурылі ва ўрочышчы Курапаты "лаўку Клінтана" — мемарыяльны знак, устаноўлены прэзідэнтам ЗША Білам Клінтанам у 1994 годзе "ад народа Злучаных Штатаў Амерыкі народу Беларусі дзеля памяці" ("от народа Соединенных Штатов Америки народу Беларуси во имя памяти").

Летам 2001 года лаўка была разбіта вандаламі, пасля чаго яна была адрэстаўравана і зноў устаноўлена 15 студзеня 2002 года пасолам ЗША ў Беларусі Майклам Козакам. Беларускі скульптар Алесь Шатэрнік, які ажыццявіў рэстаўрацыю знака, устанавіў на месцы расколу гарызантальнай гранітнай пліты металічны вянок, што сімвалізуе пакаянне беларусаў, якія не змаглі зберагчы помнік ад апаганення. Пазней лаўка Клінтана не раз апаганьвалася невядомымі асобамі, апошнія выпадкі зафіксаваныя ў лістападзе-снежні 2005 года. Тады вандалы скінулі лаўку з вертыкальна ўстаноўленых гранітных падножжаў і залілі яе чырвонай фарбай.

**Таццяна КАРАВЯНКОВА.**

**АФІЦЫЁЗ**

# Міхаіл Мясніковіч шкадуе, што ў свой час не падтрымаў ЗША

*Тады нафтагазавага канфлікту з Расіяй магло б і не быць...*

"Расія ў адносінах да Беларусі паступіла, мякка кажучы, вельмі непрыгожа і нядобрасумленна, — *сказаў "Народнай волі" старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, былы кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта* **Міхаіл Мясніковіч**, *выказваючы сваё стаўленне да праблемы з энерганосьбітамі.* — Дакладней, не Расія, а асобныя службовыя асобы. А палітыкі пагадзіліся... Я лічу, што гэта няправільна. Ёсць каштоўнасці, якія нельга вымяраць доларамі і рублямі.

Магу сказаць іншае. У 1992 годзе я быў на адным, лічу, важным пасяджэнні ў Кіеве, дзе разглядалася пытанне пра тое, як нафту і газ з Азербайджана, Ірана і іншых дзяржаў падаць у Еўропу, мінуючы Расію. У гэтым пасяджэнні бралі ўдзел Беларусь, Украіна, Малдова, Грузія і Азербайджан. Старшынствавалі на пасяджэнні Злучаныя Штаты Амерыкі. Але беларусы тады адстойвалі расійскі вектар. Я вось зараз думаю: напэўна, мы тады даволі прымітыўна разглядалі перспектыву палітычных адносін...

Я, шчыра кажучы, ад расійскага боку не чакаў такога выхаду з саюзных адносін... Мне, можа, як нікому іншаму балюча, бо я, што называецца, рабіў усе гэтыя пагадненні, дамоўленасці і г.д. Роўныя ўмовы і роўныя правы — гэта базавыя прынцыпы нашых пагадненняў. Але, аказваецца, можна праігнараваць тое, што было падпісана, ратыфікавана, і паставіць нейкія прыватныя інтарэсы вышэй за ўсё гэта...

Я лічу, што ў гэтай сітуацыі мы павінны рэчы называць сваімі імёнамі..."



**ДАРЭЧЫ**

У наступным годзе ўжо павінна распачацца практычная праца па будаўніцтве беларускай АЭС.

Пра гэта Мясніковіч паведаміў на сустрэчы з журналістамі.

Паводле ягоных слоў, Беларусь пры выбары праекта для будаўніцтва атамнай станцыі не прывязваецца да канкрэтнай краіны-партнёра, а сыходзіць перш за ўсё *"з меркаванняў надзейнасці".*

Акрамя гэтага, Беларусь пры выбары партнёраў будзе таксама ўлічваць і *"пытанні, звязаныя з палітычнымі нюансамі".*

На думку Мясніковіча, адной з самых перадавых сёння з'яўляецца французская ядзерная энергетыка. У прыватнасці, Беларусь будзе весці перамовы пра АЭС з кампаніяй "Арэва".

Як сказаў Мясніковіч, мяркуемы кошт будаўніцтва АЭС складзе прыблізна 2,5—3 мільярды долараў у разліку на 2 энергаблокі па 1 тысячы МВт. Першы энергаблок плануецца ўвесці ў эксплуатацыю да 2014 года, другі — да 2020-га.

На канчатковае вырашэнне ўсіх пытаняў, якія тычацца абмеркавання і выбару праекта і крыніцы фінансавання, на думку Мясніковіча, спатрэбіцца максімум паўгода.

**Марына КОКТЫШ.**

**ТЫМ ЧАСАМ**

## *Мясніковіч ужо адзначыў наваселле*

Як ужо неаднойчы паведамляла "Народная воля", асабліва набліжаныя да Лукашэнкі чыноўнікі некалькі гадоў таму атрымалі магчымасць пабудаваць катэджы ў адным з самых прэстыжных раёнаў Мінска — недалёка ад прэзідэнцкай рэзідэнцыі "Дразды".

Асобныя чыноўнікі казалі, што грошай на будаўніцтва ў іх няма, таму яны будуць звяртацца ў банк за крэдытамі.

Цікава, што за даволі кароткі час многія службовыя асобы паспелі не толькі пабудаваць прыгожыя дамы, але і вярнуць крэдыты.

Старшыня прэзідыума Акадэміі навук Беларусі — адзін з тых, хто ўжо выплаціў крэдыт.

*"Так, я ўжо скончыў будаўніцтва дома і даўно жыву там,* — распавёў **Міхаіл Мясніковіч** журналісту "Народнай волі". — *На будаўніцтва я браў крэдыт — прыблізна 150 мільёнаў рублёў. Да таго ж, пабудаваўшы дом, я прадаў і былую дачу, і кватэру. Толькі машыну пакінуў. Крэдыт ужо вярнуў, засталіся толькі некаторыя прыватныя пытанні..."*

Да ведама: па словах Мясніковіча, яго месячны заробак складае прыблізна 1000 амерыканскіх грашовых адзінак.

**ШЧЫРЫЯ ПРЫЗНАННІ**

## *Гарачы студзень*

**"Гэта быў цяжкі месяц для ўрада і рэальнай эканомікі", — заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі, падводзячы вынікі працы ўрада ў студзені на пасяджэнні Савета міністраў у аўторак.**

Першы намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка, выступаючы на пасяджэнні Саўміна з дакладам, заявіў, што *"паказчыкі бюджэту Беларусі могуць быць зменены па выніках студзеня-лютага 2007 года". "Комплекс мер па мінімізацыі страт бюджэту ў сувязі з ростам цэн на расійскі прыродны газ і зменай умоў паставак нафты грунтуецца на магчымым змяненні параметраў даходнай і расходнай частак бюджэту",* — сказаў ён. Гэта значыць, што ўрад рыхтуецца да перагляду неабходных расходаў. Нагадаем, што адно з абавязацельстваў перад насельніцтвам улада ўжо не выканала: абяцанае павышэнне пенсій перанесена на больш позні тэрміны.

**Алег СНОЎ.**

**ДЫПКУР'ЕР**

## *За заслугі перад Аўстрыяй і Беларуссю*

**Пасол Латвіі ў Беларусі Майра Мора ўзнагароджана Вялікім залатым знакам пашаны з зоркай за заслугі перад Аўстрыйскай рэспублікай.**

Як паведаміла Майра Мора, узнагароду ёй уручыў Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Аўстрыі ў Расіі і Беларусі па сумяшчальніцтве Марцін Вукавіч.

Нагадаем, у першым паўгоддзі 2006 года Аўстрыя з'яўлялася краінай — старшынёй Еўрасаюза. Паколькі Аўстрыя не мае дыпламатычнага прадстаўніцтва ў Мінску, пасольства Латвіі выконвала абавязкі мясцовага старшынства.

*"Я вельмі ўдзячна прэзідэнту і Міністэрству замежных спраў Аўстрыі за такую высокую ацэнку нашай працы ў Беларусі,* — сказала М.Мора. — *Для мяне гэта вялікі гонар — атрымаць такую высокую ўзнагароду".*

## *Мінск чакае афіцыйнага пасланніка Уга Чавеса*

**Пасольства Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла плануецца адкрыць у Мінску ў першым квартале 2007 года.**

Пра гэта паведаміў БелаПАН Часовы Павераны ў справах Венесуэлы ў Беларусі Амерыка Дыяс Нуньес.

Ён зазначыў, што да адкрыцця пасольства ўсё гатова. *"Мы чакаем рашэння з Венесуэлы",* — сказаў дыпламат. Паводле яго слоў, рашэнне можа быць прынята ў канцы лютага або на пачатку сакавіка. Пасольства будзе знаходзіцца ў Мінску па вул. Чырвонаармейскай, 22.

**Таццяна КАРАВЯНКОВА.**

Народная Воля http://www.nv-online.info
9 ЛЮТАГА 2007 г.

СИТУАЦИЯ

# Перед забастовкой?

*Президент фактически поставил крест на такой социальной прослойке, как "индивидуальные предприниматели". С 1 января 2008 года нельзя будет нанимать на работу более трех человек, да и те должны быть только родственниками. А если человек из детдома? А если живет далеко от родни? А куда идти после того, как станет невозможно работать на рынках?*

*Индивидуальные предприниматели заявляют о предзабастовочной ситуации в стране, которая весной может выплеснуться на улицы. Во главе активного, сопряженного с выходом на улицы, сопротивления стали незарегистрированные предпринимательские структуры: Республиканский стачком предпринимателей и Координационный совет индивидуальных предпринимателей.*

*Сегодня гость "Народной воли" — предприниматель из Гродно* ***Валерий ЛЕВОНЕВСКИЙ****.*



— Предприниматели будут выкручиваться, как обычно — каждый как может. Часть предпринимателей предпочитает давать взятки (откупаться). Принцип — не важны законы, а важно взаимопонимание, — лет пять, как укоренился в сознании у многих. Наученные горьким опытом своих коллег, которые уже осуждены за неправильное понимание вопросительно-просящего взгляда проверяющего, они предпочитают платить взятки.

Кто-то, конечно, закончит свой бизнес.

Наиболее активные и те, кому платить взятки надоело, примут участие в подготовке акций протеста. Уверен, что при хорошей подготовке акции протеста нас поддержит большинство предпринимателей. Задача актива и руководителей предпринимательских структур — провести разъяснительную работу среди людей. Любая акция протеста — это возможность заявки на решение проблемы. Чем громче будет заявка, тем быстрее может решиться проблема. Первым этапом борьбы станет попытка найти компромисс с властями.

**— Но все попытки ваших коллег из "Перспективы" сесть за стол переговоров с власть имущими закончились полным провалом и напутствием...**

— Не думаю, что компромисс с нынешними властями в принципе возможен. Но в наших действиях простая логика. Если власть почувствует силу, то пойдет на временные уступки; если сила будет постоянной, то и уступки будут постоянны. "Переговоры", которые имитировались последние два года, — это блеф. Основная цель таких заседаний — заболтать проблему. К сожалению, это удалось. И проблема предпринимателей не в том, что принят тот или иной плохой указ. Она гораздо глубже. И нынешний глава государства уже когда-то озвучил свою позицию на этот счет, назвав предпринимателей *"вшивыми блохами"*. Один из очень высокопоставленных чиновников Беларуси в пылу откровенной беседы со мной сказал прямо: *"Мы бы вас давно задавили, да девать вас некуда"*. И это не частное мнение — это официальная позиция государства.

Не думаю, что просто одним выходом на улицу можно решить все накопившиеся проблемы. Только системный подход, проведение нескольких акций протеста может сдвинуть ситуацию с мертвой точки. Будем начинать с митингов, однодневных акций. Не поможет — откажемся от уплаты налогов и прекратим работу.

**— Но будет ли это эффективным, поможет ли, если власти в принципе решились ликвидировать институт "индивидуальных предпринимателей"?**

— Уличные акции протеста, массовый невыход на работу, неуплата налогов — это как раз то, чего больше всего боится власть. Особенно, когда выдвигаются политические требования. Почему два года назад посадили в тюрьму нас с Васильевым? Почему сегодня сидит А. Козулин? Потому что выводили людей на улицу. И с политическими требованиями.

Что касается ликвидации института индивидуальных предпринимателей, то это сделать невозможно. Неважно, как будут называться эти люди, которые занимаются делом на свой страх и риск — ИП, ЧП или еще как-либо. Предприниматель — это состояние души, способ мышления, а не юридический термин, способ выживания. Лишение людей возможности трудиться, заниматься легально своим делом приведет к резкой политизации предпринимателей и росту их политической активности. Представьте: сотни тысяч людей, которые останутся без средств к существованию, выйдут на улицу вместе с семьями. И тогда все само собой разрешится.

**— Судя по всему, в лагере предпринимательских структур, как и в оппозиции в целом, отсутствует единство. Незарегистрированные предпринимательские структуры исповедуют радикальный стиль борьбы за свои права, зарегистрированные — более сдержанны. Региональные активисты обратились к спикеру Владимиру Коноплеву с предложением провести 22 мая парламентские слушания "О развитии предпринимательства". Быть может, следовало бы вначале прийти к согласию между собой? Помните знаменитое: "В единстве — сила!"?**

— В идеале, конечно, да. Но идея утопическая. Каждая структура преследует свои цели и задачи. Ряд предпринимательских структур создан государством с одной целью — развалить единство предпринимателей. В этой связи у меня встречный вопрос: можно ли объединить все газеты Беларуси? Или все партии? Или всех домохозяек?..

Мы не ставим перед собой утопических целей. Я считаю, что только активными акциями протеста можно решить проблемы предпринимателей. Думаю, что речь должна идти о сторонниках и единомышленниках. Эта категория людей и должна объединяться. Что касается остальных... Некоторые руководители и члены так называемых предпринимательских структур имеют самое отдаленное отношение собственно к предпринимательству и его проблемам.

К парламентским слушаниям я отношусь очень скептически. Но и эту работу кто-то должен вести. Поэтому пускай проводят слушания. Один чиновник будет слушать другого, а третий — принимать решения. Все это от лукавого. Повторюсь: единства в данном деле быть не может в принципе, так как много времени будет уходить на внутреннюю борьбу и разборки. Все перечисленные предпринимательские структуры сегодня реально объединяют не более 1 процента предпринимателей Беларуси — проще работать с 99 процентами предпринимателей, которые не входят в эти структуры, чем терять время на мнимое объединение. Так проще, и КПД работы будет выше.

**— Спасибо за откровенный разговор.**

**Беседовал Глеб ХМЕЛЬНИЦКИЙ.**

ДАРЭЧЫ

На 14 лютага запланавана сустрэча прадстаўнікоў урада і Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі з прадпрымальнікамі. Як паведаміў БелаПАН адзін з удзельнікаў дадзенай сустрэчы, старшыня грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз прадпрымальнікаў" (БСП) Аляксандр Патупа, фармат мерапрыемства пакуль удакладняецца, аднак ужо вядома, што з боку ўладаў у ім возьмуць удзел кіраўнік прэзідэнцкай адміністрацыі Генадзь Нявыглас, яго наместнікі Наталля Пяткевіч і Леанід Анфімаў, віцэ-прэм'ер Андрэй Кабякоў і іншыя члены ўрада. Мяркуюць, што сустрэча адбудзецца ў будынку Нацыянальнай бібліятэкі.

А.Патупа збіраецца прадставіць службоўцам пакет дакументаў, якія неабходна прыняць для рэальнага паляпшэння бізнес-клімату ў краіне. *"Неабходны сур'ёзныя комплексныя меры па інтэнсіўнай сістэмнай лібералізацыі эканомікі,* — лічыць лідэр БСП. — *Ва ўмовах падаражання энергарэсурсаў прыватны бізнес, па сутнасці, застаецца адзіным рэзервам, які могуць выкарыстаць улады, каб не дапусціць абвалу эканомікі. Неабходна прымаць (прычым неадкладна) вызначаныя дакументы. Патрэбна добра прапрацаваная прэзідэнцкая дырэктыва па развіцці прадпрымальніцтва і суправаджальныя дакументы, датычныя павелічэння гарантый для долі бізнесу, аптымізацыі падатковай і ліцэнзійнай сістэмы".*

А.Патупа асобна адзначыў той факт, што сустрэча арганізуецца з ініцыятывы ўлад. Гэта, па яго словах, дае падставы для некаторага аптымізму. *"Спадзяюся, што падрыхтаваныя намі дакументы стануць своеасаблівай стартавай праграмай у галіне прадпрымальніцтва. А надалей будзе весціся вельмі вялікая праца, у першую чаргу па знішчэнні шматлікіх адміністрацыйных бар'ераў"*, — сказаў лідэр БСП.

ЧУЛІ?

## *Расія выбірае альтэрнатыўныя нафтавыя маршруты*

**ААТ "Акционерная компания па транспорту нефти "Транснефть" зацвердзіла тэхнічны праект будаўніцтва экспартнага нафтаправода ў абыход Беларусі.**

*"Мы прынялі рашэнне і будзем развіваць Балтыйскую трубаправодную сістэму па маршруце Унеча (мяжа з Беларуссю) да порта Прыморск"*, — заявіў прэзідэнт "Транснефти" Сямён Вайншток у эфіры праграмы "Вести" тэлеканала "Россия".

Паводле слоў С.Вайнштока, размова ідзе пра павелічэнне прапускнога аб'ёму партовага тэрмінала на 50 млн тон нафты.

*"Першая чарга — гэта павелічэнне прапускной магчымасці БТС на 50 млн тон, і мы над гэтым пытаннем ужо актыўна працуем*, — паведаміў кіраўнік "Транснефти". — *Сёння прайшоў тэхсавет, і ён пацвердзіў дэкларацыю аб намеры. 12 лютага павінны выйсці 896 вышукальнікаў, якія ўжо адмабілізаваны на мяркуемую трасу будаўніцтва".*

*"Вядома, гэта вельмі дорага, вельмі і вельмі дорага*, — зазначыў С.Вайншток. — *І мы гаварылі з калегамі, што, калі б у нас не былі такія рызыкі ад сумежных дзяржаў, такія вялікія грошы не трэба было б траціць"*.

**Дзмітрый УЛАСАЎ.**

## *Віктар Мязяк адзіны ў краіне атрымаў вадзіцельскае пасведчанне цалкам на роднай мове*

Індывідуальны прадпрымальнік і член сойма Партыі БНФ Віктар Мязяк месяц таму набыў новую машыну. Дагэтуль ён не быў за рулём чатыры гады, таму патрабавалася зрабіць новае вадзіцельскае пасведчанне (старое яму выдалі яшчэ ў 1991 годзе).

У Баранавіцкім міжраённым рэгістрацыйна-экзаменацыйным аддзяленні ДАІ (МРЭА) Віктар Мязяк напісаў заяву на новае пасведчанне і папрасіў супрацоўніцу зрабіць яго поўнасцю па-беларуску. Яна паведаміла, што ў камп'ютэрнай праграме, з дапамогай якой друкуюцца пасведчанні, беларуская мова не выкарыстоўваецца і таму зрабіць тут нічога нельга.

Тады спадар Мязяк звярнуўся да начальніка МРЭА. Па словах баранавіцкага прадпрымальніка, той быў шчыра здзіўлены і сказаў, што гэта першы такі выпадак. Начальнік МРЭА ўзяў некалькі дзён на тое, каб параіцца з абласным кіраўніцтвам.

Праз тыдзень Віктару Мезяку паведамілі: вырашыць праблему могуць толькі ў рэспубліканскім ДАІ ў Мінску. У сталіцы яго накіравалі ў кабінет да нейкага высокага службоўца, імя якога Віктар Мязяк, на жаль, не запомніў. Пры члене сойму Партыі БНФ службовец зрабіў некалькі тэлефонных званкоў, а пасля паведаміў: "Персанальна для вас выдадзім цалкам беларускамоўнае пасведчанне".

Праз некалькі дзён у баранавіцкім МРЭА на цэлую гадзіну спынілі прыём астатніх наведвальнікаў, каб змяніць камп'ютэрную праграму і зрабіць Віктару Мезяку новае вадзіцельскае пасведчанне.

— Я лічу, што людзям, якія размаўляюць па-беларуску, не трэба баяцца заяўляць аб сваіх правах, — кажа Віктар Мязяк. — Яны могуць мець усе дакументы на сваёй роднай мове — для гэтага трэба проста набрацца смеласці. Па выніках перапісу насельніцтва 1999 года, 37 працэнтаў грамадзян нашай краіны размаўляюць дома па-беларуску. Але чамусьці іх не чуваць на вуліцах, яны не маюць дакументаў на роднай мове. Па-мойму, прычына гэтага ў іх саміх. Трэба проста не баяцца.

**Сяргей КАРАБАНАЎ.**

СІТУАЦЫЯ

## *«Халодная вайна» мясцовага маштабу*

У Тураве амаль два гады не працуе медыцынскі рэабілітацыйны цэнтр, створаны ў гарадской бальніцы на амерыканскія сродкі пры падтрымцы амбасады ЗША ў Беларусі. Тут мясцовыя жыхары меліся атрымліваць вода- і гразелячэнне, масаж, фізіяпрацэдуры, фітатэрапію.

Як паведаміў карэспандэнту БелаПАН галоўны ўрач Жыткавіцкай цэнтральнай раённай бальніцы Канстанцін Грамак, якому падпарадкаваны мясцовыя медыцынскія ўстановы, рэабілітацыйны цэнтр у Тураве не можа працаваць з прычыны адсутнасці вентыляцыі і каналізацыі. На гэта патрэбна звыш 100 млн рублёў. Такіх сродкаў медыцынскія ўстановы раёна не маюць. Да таго ж рэабілітацыйнаму цэнтру патрэбны некалькі спецыялістаў, на што таксама бракуе грошай. Цэнтру трэба надаваць статус абласной медыцынскай установы і праводзіць там рэабілітацыю жыхароў не толькі Жыткавіцкага, але і суседніх раёнаў.

Былы галоўны ўрач тураўскай бальніцы Ірына Сяргейчык, высілкамі якой быў атрыманы грант ЗША на стварэнне цэнтра, лічыць, што мясцовыя ўлады нічога не зрабілі, каб выканаць сваю частку работы.

Дарэчы, пасля адкрыцця рэабілітацыйнага цэнтра раённае медыцынскае начальства звольніла з працы І.Сяргейчык нібыта за неадпаведнасць пасадзе галоўнага ўрача. Суд яе не аднавіў на працы. Тураўская бальніца з раённай пераведзена ў статус гарадской. Пасада галоўнага ўрача заменена на пасаду загадчыка.

Са звальненнем І.Сяргейчык тураўская бальніца, якая абслугоўвала каля 11 тыс. навакольных жыхароў, страціла і спецыяліста ультрагукавой дыягностыкі. Сучасны апарат для абследавання ўнутраных органаў чалавека ў бальніцы прастойвае. На абследаванне жыхары тураўскай зоны цяпер павінны ездзіць у Жыткавічы — амаль за трыццаць кіламетраў. Да таго ж у жыткавіцкай райбальніцы запісваюць на апарат ультрагукавой дыягностыкі на тры месяцы наперад.

**Анатоль ГАТОЎЧЫЦ.**

СЛЕДСТВА

## *...а горад падумаў: звычайны крадзеж*

Галоўнае ўпраўленне папярэдняга расследавання МУС Беларусі завяршыла следства па крымінальнай справе аб крадзяжы грашовых сродкаў у Салігорскага гарвыканкама і ВА "Беларуськалій". Справа знаходзілася на кантролі Аляксандра Лукашэнкі і цяпер перададзена ў суд.

Як паведамілі ў МУС, кіраўнікі шэрагу камерцыйных структур — падрадчыкі рамонтна-будаўнічых работ — заключалі фальшывыя дагаворы на пастаўкі матэрыялаў і абсталявання са значным завышэннем іх рэальнага кошту. У выніку было скрадзена больш за 116 мільёнаў рублёў. У арганізаваную злачынную групу ўваходзілі дзесяць чалавек, а затрыманне самога арганізатара прадухіліла шэраг іншых злачынстваў з цяжкімі наступствамі, здзяйсненне якіх ён планаваў, калі знаходзіўся ў СІЗА, зазначылі ў МУС. Пры вобыску ў лідэра злачыннай групы была знойдзена агнястрэльная зброя з боепрыпасамі і больш за 10 кілаграмаў узрыўчаткі.

**Вячаслаў БУДКЕВІЧ.**

## *На вучобу ў Пекін?*

***Міністэрства адукацыі Беларусі прадаставіць стыпендыі студэнтам, аспірантам і стажорам для навучання ў Кітаі ў 2007—2008 навучальным годзе.***

Навучэнцы павінны валодаць кітайскай мовай, а стажоры і аспіранты — англійскай. Навучанне запланавана на тэрмін ад 3 месяцаў да 1 года.

Па дадзенай праграме сваіх студэнтаў збіраецца адправіць Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. Прычым наша ўстанова аплачвае праезд ад Мінска да Пекіна ў два бакі. Выдаткі ў Кітаі аплачвае прымаючы бок.

Стыпендыяты вызваляюцца ад платы за навучанне, пражыванне, карыстанне падручнікамі, кітайскі універсітэт выплачвае ім стыпендыю, паведамляе БЕЛТА.

ТЕМА ДНЯ

# Куда идешь?

*(Окончание. Начало на 1-й стр)*

Однако это детали. Принципиально и важно то, что в политическом мышлении белорусского "кормчего" слышны новые интонации по поводу места и роли Запада как контрагента Беларуси. *"Не надо сегодня упрекать Лукашенко, что он повернул на Запад... Мы никаких поворотов и разворотов делать не собираемся. Но мы четко поняли то, о чем не говорили раньше, — надо диверсифицировать импорт и экспорт. Нельзя быть зависимыми от одной страны".*

Золотые слова, жаль только, что они не прозвучали на заре правления Александра Григорьевича. Впрочем, лучше позже, чем никогда.

В интервью немецкому изданию Александр Лукашенко о своих стратегических умонастроениях и видах на сотрудничество с Западом говорил без оглядки на разочарованный электорат, который он годами кормил баснями об интеграционном рае. Поэтому немецкий журналист услышал от белорусского руководителя доверительные (рассчитанные на западное ухо) суждения о том, что конфликт с Россией ясно продемонстрировал — *"нам надо активнее работать с западными и американскими инвесторами. Тогда Россия не будет так вот орудовать в Беларуси. А так, знаете, государственные предприятия, хорошо функционирующие. Руки чешутся прихватить..."*

И дальше А.Лукашенко сформулировал тезис, который при определенных условиях (сохранении нынешнего характера отношений между Москвой и Минском), на мой взгляд, мог бы стать поворотным во всей новейшей политике белорусского лидера. *"Мы,* — сообщил он, — *будем предлагать западным инвесторам конкретные программы, мы будем принимать их у себя... Если бы у нас "Белтрансгаз" или нефтепроводы были акционированы с немецкими или американскими фирмами, Вы считаете, что Россия пошла бы на такой беспрецедентный шаг? Никогда в жизни. Никогда".*

Должен признаться в том, что... искренне разделяю данный тезис Александра Григорьевича. С конца 90-х годов неоднократно писал о том, что успешно противостоять давлению российского капитала можно только с помощью западного капитала, его присутствия в белорусской экономике. Впрочем, идея не мною изобретена, давно и успешно применяется, например, в Казахстане.

### Плата за западную помощь

Итак, к новой стратегии белорусскую власть подталкивает реальность, которая решительно дала о себе знать, когда официальный Минск лоб в лоб столкнулся с экономическими и политическими притязаниями российской стороны. Белорусско-российский нефтегазовый конфликт (и его последствия) вольно или невольно побуждает хозяина "Красного дома" более прагматично отнестись к усвоению белорусской экономикой механизмов рынка. В ходе совещания на "Нафтане" белорусский руководитель озвучил несколько новых задач, которые напрямую касаются практики рыночного хозяйствования, исключающей прежний (привилегированный) порядок кумовских отношений с российской экономикой. Правительство получило задание "найти" альтернативные источники поставок энергоносителей в страну.

Однако особое внимание Александр Лукашенко обратил на проблему чрезмерно высокой энергоемкости белорусского производства. В присущем ему командном стиле глава государства потребовал от министров: энергоемкость ВВП в Беларуси должна быть уменьшена "в два раза" (или надо "в два раза" увеличить выпуск продукции).

Министры, естественно, взяли под козырек. Но как это сделать? Производство работает на пределе возможностей, оборудование в большинстве своем изношено, технологии устарели. Единственный выход — радикальное обновление заводов и фабрик. Для этого нужны большие инвестиции. Внутренние резервы явно слабы, в государственном бюджете в результате повышения цен на газ и нефть образовалась огромная дыра. По оценке самого А.Лукашенко, размером в 3,5 миллиарда долларов. Остается надежда на внешние инвестиции, частный капитал. В условиях конфликта с Россией Минск вольно или невольно вынужден обращать свои взоры на западных инвесторов. Запад готов помогать Беларуси. Но платой за помощь должна стать ее институциональная эволюция в сторону демократии. Верховенство закона, права личности, свобода конкуренции — базовые ценности, которых будут добиваться в Беларуси держатели западных инвестиций.

Понимают ли в "Красном доме" политическую роль инвестиций, частного капитала? Пока трудно ответить на вопрос однозначно. Но вот что показательно. Заместитель главы Администрации президента Леонид Анфимов специально посвятил свое выступление на совещании 23 января этой теме. Из его слов следует, что чиновники до сих пор не научились эффективно и оперативно работать с инвесторами, способствовать развитию частной инициативы. Обобщая тему, Александр Лукашенко поставил задачу "наращивать приток иностранных инвестиций" в страну и поддержал предложения об "усилении роли частного бизнеса" в экономике Беларуси.

***

"Камо грядеши *("куда идешь")*?" — спрашивали встречного путника в старину. Этот же вопрос хотели бы задать Александру Лукашенко многие, кого волнует перспектива стратегического развития Беларуси. Думаю, однако, что окончательного ответа не знает даже сам Александр Григорьевич. Его все еще подмывает взять реванш за то, что в 2007 году Беларусь должна увеличить платежи России в 2,14 раза. Белорусский начальник публично предлагает российской стороне "заплатить нам" за землю под трубопроводом, за транспортировку нефти и прочие услуги. Пытается испугать Москву переходом "единственного союзника" на сторону Запада. Одновременно Лукашенко хочет заверить (как в беседе с Зюгановым), что он все так же предан делу белорусско-российской интеграции. Посылает сигнал о том, что готов заключить с Кремлем мировую... Владимир Путин ответил на это по-царски надменно, почти равнодушно: *"Ну конечно, может быть, хотелось, и дальше все чтобы было как прежде. Но невозможно же так. Это же невозможно, если мы разные государства, понимаете?"* (Пресс-конференция В.Путина 1.02.2007 г.)

Судить о том, что Беларусь выбрала новую стратегию, станет возможно, если в стране начнут возрождаться демократические процедуры, получит дальнейшее законное развитие частный сектор, встанут с колен независимые СМИ. Когда обитатели "Красного дома" приучатся утверждать свою власть в обществе не авторитарными методами, а с помощью собственных партийных структур, в процессе их конкурентной борьбы с другими политическими субъектами...

Однако не будем заглядывать далеко за горизонт.

БУДЗЬЦЕ ЗДАРОВЫ!

## *Напярэдадні эпідэміі*

У Беларусі ўжо рэгіструецца рост захворвання на грып і вострыя рэспіраторна-вірусныя інфекцыі (ВРВІ). Аднак перавышэнне эпідэмічнага парогу пакуль не зафіксавана ні ў адным з кантрольных гарадоў, паведаміў БелаПАН галоўны эпідэміёлаг Міністэрства аховы здароўя Анатоль Кажамякін.

Так, паводле яго слоў, на мінулым тыдні па медыцынскую дапамогу звярнуліся прыблізна 47,7 тысячы чалавек, што на 13% больш у параўнанні з папярэднім тыднем. Сярод прычын захворванняў пакуль пераважаюць негрыпозныя інфекцыі.

Паводле слоў спецыяліста, марознае надвор'е можа правакаваць пераахаладжэнне грамадзян, што ў сваю чаргу можа быць прычынай захворвання.

У той жа час у шэрагу рэгіёнаў Расіі, пераважна на поўначы краіны, ужо аб'яўлена эпідэмія грыпу.

**Таццяна ДАРАШЧОНАК.**

ПАЗІЦЫЯ

# Пазіцыя партыі маральная і ясная

Пазіцыя Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) адносна палітычных, сацыяльных, эканамічных працэсаў, якія адбываюцца ў краіне, маральная і ясная. Яна адлюстроўвае як мэты партыі, так і інтарэсы большасці беларускага грамадства: усё, што на карысць краіне, падтрымліваць і рабіць; усё, што служыць справе сцвярджэння нацыі і ўмацаванню беларускай дзяржавы, развіваць; усё, што вядзе да сцвярджэння свабод і правоў чалавека, адстойваць; усё, што павялічвае дабрабыт і ўмацоўвае сацыяльны статус чалавека ў грамадстве, вітаць і заахвочваць.

Пазіцыя БСДП у адносінах да краін свету і да суседзяў узважаная. Партыя заўжды выступала супраць палітычнага авантурызму і карпаратыўнага этатызму беларускіх уладаў, супраць самаізаляцыі краіны, супраць свары з суседзямі і цывілізаванымі краінамі свету.

БСДП паслядоўна адстойвае добрасуседскую палітыку, якая патрабуе ўлічваць нацыянальныя інтарэсы нашых партнёраў як на захадзе, поўначы, поўдні, так і на ўсходзе. Нацыянальныя інтарэсы Украіны, Расійскай Федэрацыі, краін Еўрасаюза ў Беларусі павінны стаць важнай тэмай публічнага і сяброўскага дыялогу суседніх народаў. БСДП выступае супраць таго, каб лёс дзесяцімільённага беларускага народа аднаасобна і кулуарна вырашалі правіцелі і алігархічныя групоўкі.

Народы заўжды імкнуцца да сяброўства, а карпаратыўныя групоўкі (палітычныя, эканамічныя і г.д.) — да барацьбы і свары за свае карыслівыя інтарэсы. У беларускага народа няма ворагаў. Нашы суседзі — нашы сябры і партнёры ў справе сцвярджэння суверэннай незалежнай і заможнай Беларусі. Добрыя справы можна рабіць толькі з добрымі намерамі і добрымі сябрамі і толькі на падмурку сяброўскіх адносін з суседзямі.

БСДП патрабуе ад уладаў неадкладна распачаць і паслядоўна весці сяброўскі дыялог з суседзямі, што стане асновай павагі да нашай краіны і важным сродкам вырашэння эканамічных, сацыяльных і палітычных праблем беларускага грамадства.

БСДП патрабуе ад кіраўніцтва краіны распачаць эфектыўную палітыку нацыянальнай згоды і яднання беларускага грамадства перад няпростымі выклікамі сучаснага глабальнага свету. Дзеля гэтага БСДП патрабуе ад уладаў зрабіць першыя неабходныя крокі: распрацаваць дзяржаўную праграму адраджэння нацыянальнага гонару беларускага народа за сваю краіну і яе гістарычную спадчыну; адмяніць забарону нацыянальнага сцяга і іншых гістарычных сімвалаў (без мінулага няма будучыні); вызваліць з турмы экс-кандыдата ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, лідэра беларускіх сацыял-дэмакратаў Аляксандра Казуліна і ўсіх палітвязняў. 25 сакавіка разам з прыхільнікамі перамен правесці агульнанацыянальны сход на Кастрычніцкай плошчы (плошча Каліноўскага). На гэтым усенародным сходзе абвясціць 25 сакавіка дзяржаўным святам яднання і лічыць гэты дзень пачаткам кансалідацыі беларускага грамадства, пачаткам адкрытага дыялогу ўладаў з прыхільнікамі перамен у краіне.

Гэтыя першапачатковыя крокі з боку ўладаў створаць умовы для перамоў БСДП і ўсіх дэмакратычных сіл Беларусі з кіраўніцтвам краіны на карысць нацыянальных інтарэсаў беларускай дзяржавы і ўсяго беларускага народу.

Мы розныя, і нас шмат, але Беларусь у нас адна і адзіная!

**Анатоль ЛЯЎКОВІЧ, выконваючы абавязкі старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада), кандыдат філасофскіх навук.**

СКАНДАЛ

# Былыя паплечнікі разводзяцца

**Сойм Партыі БНФ падзякаваў лідэру дэмакратычных сіл Аляксандру Мілінкевічу за сумесную працу ў перыяд леташніх прэзідэнцкіх выбараў зімой-вясной 2006 года. Але надалей шляхі Партыі БНФ, якая прыкладала нечалавечыя высілкі, каб адзіным кандыдатам у прэзідэнты ад дэмакратычных сіл Беларусі стаў гадаванец "трэцяга сектара" з Гродна, і былога "адзінага" разыходзяцца. Кіраўніцтва партыі перакананa: цяпер, калі ў краіне няма кароткатэрміновых палітычных кампаній, БНФ варта ісці далей сваім шляхам.**

*"Партыя БНФ не адмаўляецца ад супрацы са спадаром Мілінкевічам,* — заявіў у інтэрв'ю партыйнай прэс-службе намеснік старшыні Партыі БНФ Юрась Хадыка, — *яна адмаўляецца ад адвольных, бескантрольных паводзін Мілінкевіча і яго каманды, якія не рэгламентаваны ніякімі дамовамі. Самае галоўнае ў супрацы — гэта ўзаемапавага і ўлічванне інтарэсаў усіх бакоў. Мы не адмаўляем вялікай ролі Мілінкевіча падчас выбараў прэзідэнта, але тое, што ён пачаў рабіць пасля — перацягваць фронтаўцаў у свой рух* (А.Мілінкевіч стварае грамадскі рух "За свабоду!" — **Рэд.**) *— з'яўляецца вялікай небяспекай для нашай партыі".*

Дасюль адносіны развіваліся па Маякоўскаму: "Гаворым БНФ, разумеем — Мілінкевіч". І наадварот. Прычыны "разводу" пасля "доўгага і шчаслівага сумеснага жыцця" спрабуюць прааналізаваць абодва бакі.

### *Вінцук ВЯЧОРКА, старшыня Партыі БНФ:*

## «Шлюбу не было, каб гаварыць пра развод»

— Нашы стасункі захоўваюць статус-кво, ніякай новай сітуацыі няма. Шлюбу не было, каб гаварыць пра развод.

**— Калі не было шлюбу, навошта тады публічны развод? Менавіта так многія ўспрымаюць вынікі апошняга Сойму...**

— Я здзіўлены гэтым шумам і гэтымі ярлыкамі. Пытанне дачыненняў з А.Мілінкевічам наогул не выносілася ў парадак дня, дый ніякіх дакументаў наконт іх не прымалася. На парадку дня Сойму стаялі пытанні стратэгіі. Місія Партыі БНФ — быць генератарам стратэгічных падыходаў і актыўна іх ажыццяўляць. І для сябе, і для дэмакратычнай кааліцыі. Нагадаю, яшчэ летась у маі, пасля таго, як уляглiся жарсці вясны, мы выступілі з прапановай антыкрызіснай стратэгіі. Мы прадбачылі змены з усходняга боку і прапаноўвалі дэмакратычнай кааліцыі рыхтаваць грамадства да новай сітуацыі, ставіць пытанні: калі эканоміка ў тупіку, хто вінаваты і дзе выйсце з тупіка? І адказваць: выйсце — у дэмакратычных рэформах і свабодных выбарах, якія адкрыюць дарогу развароту Беларусі ў бок Еўропы.

Нашы прагнозы ўрэшце пацвердзіліся. Перад Новым годам мы прэзентавалі кнігу дакладаў "Энергетычная бяспека краін Цэнтральнай Еўропы", а праз дзень разразіўся энергетычны крызіс. Мы былі гатовы да такога развіцця падзей і адразу запусцілі вялікім тыражом брашурку "Як Беларусі вырашыць энергетычную праблему?", заахвочваючы рабіць тое самае ўсе аб'яднаныя дэмакратычныя сілы.

У першую чаргу мы думаем пра тое, што хвалюе беларускі народ, а не пра структурныя перастаноўкі і спрэчкі за лідэрства. Цягам апошніх гадоў БНФ даказаў сваю здольнасць стрымліваць партыйныя і асабістыя амбіцыі дзеля агульнай справы. Усё мінулае лета і восень мы дамагаліся ад кіраўніка Палітычнай рады стварэння і сістэматычнай працы Выканаўчага сакратарыята (штаба) аб'яднаных дэмакратычных сіл, склалі план працы, вылучылі туды людзей, добраахвотна ўзялі на сябе ўсе тэхнічныя абавязкі, не чакаючы, пакуль далучацца іншыя. На жаль, сакратарыят так і не быў запатрабаваны, Палітычная рада амаль перастала працаваць.

Таму адзін з лідэраў БНФ Віктар Івашкевіч выступіў з ініцыятывай правесці новы Кангрэс, а дэлегаваць на яго толькі тых, каго падтрымае народ — мінімум трымастамі подпісаў. Ідэя прымусіла нас падчас кампаніі пад умоўнай назвай "мясцовыя выбары" ісці да людзей, каб не толькі збіраць у іх подпісы, але гаварыць пра тое, што ім баліць.

Дарэчы, пытанне ўзаемадачыненняў з групай Мілінкевіча паўстала на Сойме з ягонай ініцыятывы. Сп. Мілінкевіч даслаў ліст з прапановай Партыі БНФ на будучым Кангрэсе дэмакратычных сіл увайсці ў ягоную фракцыю. Я прапанаваў паставіць гэтае пытанне на галасаванне, але ніводзін з 40 прысутных сяброў Сойму (з іх 17 — аўтарытэтныя прадстаўнікі рэгіёнаў) не падтрымаў нават саму пастаноўку пытання. Сойм яшчэ ў лістападзе вырашыў, што сябры БНФ уваходзяць толькі ў фракцыю БНФ. Гэта натуральна. Партыя БНФ ёсць самастойны і немалаважны палітычны суб'ект, і не можа быць, каб у будучай Палітычнай радзе яна не была прадстаўлена. Няхай там будзем і мы, і Мілінкевіч, і іншыя партыі і групы, якія вылучылі дастаткова дэлегатаў.

**— Ваш намеснік Юрый Хадыка абвінаваціў Аляксандра Мілінкевіча ў перацягванні партыйных актывістаў у свой рух "За свабоду!". Ці сапраўды такія факты мелі месца?**

— Папраўдзе, няма куды перацягваць. Гаворка пра рух вядзецца даўно, але няма ні яго арганізацыйнай канцэпцыі, ні стратэгіі. Мы напачатку адстойвалі пазіцыю, што рухам "За свабоду!" павінна лічыцца ўся дзейнасць АДС. Але ў верасні Аляксандр Мілінкевіч абвясціў пра іншы, вузейшы фармат руху — ужо як сваёй палітычнай арганізацыі. Гэта, на жаль, паніжае яго статус. З рангу надпартыйнага і тым самым прымальнага для ўсіх лідэра, ён сыходзіць на прыступку ніжэй — лідэра адной з палітычных структур. Ён заявіў, што пры стварэнні руху будзе абапірацца перадусім на людзей, якія не маюць дачынення да партый, але пры гэтым увядзе жорсткую дысцыпліну. Хаця людзі, якія хочуць рэальнай палітычнай дзейнасці і дысцыпліны, ідуць менавіта ў партыі. Незаангажаваныя могуць далучыцца да нечага мяккага, неабавязковага, але тады не можа быць жорсткай дысцыпліны. Думаю, памылкай Аляксандра Мілінкевіча было з падачы свайго акружэння атакаваць палітычныя партыі ў прынцыпе, што ён пачаў рабіць з верасня.

Спрабуючы ствараць свой рух і адчуўшы вострую кадравую праблему, акружэнне А.Мілінкевіча пачало звяртацца да сяброў існуючых партый. Гэта вядомая гісторыя, і раней многія спрабавалі займацца марным пераразмеркаваннем ужо існуючых людскіх рэсурсаў, замест таго, каб далучаць да палітыкі новыя сілы.

**— Разыходжанні ў пазіцыі Аляксандра Мілінкевіча і Партыі БНФ, такім чынам, тычацца і мэт Кангрэса дэмакратычных сіл?**

— Зараз склалася абсалютна новая сітуацыя. Трэба трохі ачомацца, навучыцца бачыць і чуць грамадства. Абыходзячы выбаршчыкаў у мікрараёне "Зялёны Луг", я ўбачыў: людзей не цікавіць уладкаванне ўнутрыапазіцыйных стасункаў. Беларускі народ цяпер як адкрытая рана — любы павеў ветру ўспрымае як боль. І нам трэба адказаць на гэты боль: што будзе з беларускай незалежнасцю, энергетыкай, інфраструктурай для яе, камунальнымі тарыфамі, заробкамі, месцамі працы, адкрытасцю нашай краіны для свету. Менавіта на гэтыя пытанні найперш трэба адказваць. Партыя БНФ такія адказы мае, мы прапануем іх кааліцыі, прапануем вынесці іх на Кангрэс, які ў першую чаргу павінен быць кангрэсам стратэгіі...



**— Цяперашнія ўнутрыапазіцыйныя арганізацыйныя разборкі сведчаць пра тое, што ўнутры дэмакратычнага лагера наступіў пэўны крызіс?**

— Ідзе дыскусія. Персанальныя і арганізацыйныя пытанні трэба вырашаць у рабочым парадку. Добра, каб мы змаглі вырашыць іх да Кангрэсу, а Кангрэс мусіць быць той трыбунай, з якой мы агучым прынцыповыя падыходы да беларускай будучыні.

**— Ці патрэбны на дадзеным этапе нейкі адзін лідэр аб'яднаных дэмакратычных сіл, і ці мае быць гэтым лідэрам Аляксандр Мілінкевіч? Якая пазіцыя партыі?**

— Да Кангрэсу ў АДС ёсць старшыня Палітычнага савета, і ім якраз з'яўляецца Мілінкевіч. Ён нясе гэтае бярэма, павінен трымаць адказнасць і арганізоўваць супольную працу. Ён добра прадстаўляе Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы ў свеце. Але калі большасць суб'ектаў палітычнага поля схіляецца да таго, што сёння няма сітуацыі прэзідэнцкіх выбараў, то трэба засяродзіцца на тым, што нас яднае, — каштоўнасці і стратэгія. Доўгатэрміновая ратацыя (як у ЕС), калі пэўная партыя ў цэлым бярэ на сябе адказнасць за каардынацыю і арганізацыю выканання рашэнняў, дазволіць захаваць адзінства. А лідэрскае пытанне ніхто не перашкаджае вырашаць сваёй уласнай дзейнасцю. Гэта пытанне не статусу, а дзейснасці. Напрыклад, сёння мы, Партыя БНФ, ініцыявалі стварэнне шырокага, шырэйшага нават за АДС, аргкамітэта Дня незалежнасці 25 сакавіка. Акцыя павінна стаць асноўнай падзеяй сакавіка, на ёй мы агучым альтэрнатыўнае бачанне будучыні Беларусі, прымем звароты да беларускага народу, да Еўрапейскага Саюза, да ўлады. Вось практычнае поле для супрацы і для дэманстрацыі лідэрскага патэнцыялу.

### *Віктар КАРНЯЕНКА:*

## «Захоўваць ілюзію адзінства няма патрэбы»

"Народная воля" дамагалася інтэрв'ю з лідэрам дэмакратычных сіл Аляксандрам Мілінкевічам больш за тыдзень. Нібыта дамовіліся, але ў "дзень ікс" А.Мілінкевіч адмовіўся ад размовы, спаслаўшыся на неабходнасць спачатку завяршыць шэраг арганізацыйных спраў. Таму за каментарыямі мы звярнуліся да Віктара Карняенкі.

Спадар Карняенка — бліжэйшы паплечнік Мілінкевіча, ідэолаг стварэння руху "За свабоду!" і наогул вылучэння малавядомага на той момант палітыка кандыдатам у прэзідэнты. Іхнія пазіцыі, па прызнанні самога А.Мілінкевіча, цалкам супадаюць.

**— З усіх палітычных сіл Партыя БНФ прыклала найбольш намаганняў, каб Аляксандр Мілінкевіч стаў адзіным дэмакратычным кандыдатам у прэзідэнты, і дамаглася гэтага; БНФ і Аляксандр Мілінкевіч ішлі поплеч ад пачатку палітычнай кампаніі да яе завяршэння, і ў народзе склалася ўражанне, што паміж вамі існуюць ідэальныя адносіны. З-за чаго наступіў крызіс у двухбаковых стасунках? Нездарма ж праз паўгода пасля выбараў кіраўніцтва партыі спецыяльна падняло пытанне пра далейшыя адносіны з лідэрам дэмакратычных сіл...**



— Я не думаю, што шляхі Мілінкевіча і патрыятычных сіл Беларусі (а Партыя БНФ ёсць частка гэтых сіл) розныя. Можна разглядаць гэтае пытанне ў двух аспектах. Першае: наколькі думка кіраўніцтва Партыі БНФ супадае з думкай шараговых сяброў партыі?..

Другое. Ад самага пачатку, калі Віктар Івашкевіч агучыў ідэю правядзення другога Кангрэса і падрыхтоўкі да Кангрэса праз мясцовыя выбары, і Мілінкевіч, і мы, ягоныя паплечнікі, падтрымалі ідэю, мяркуючы, што патрыятычна настроеныя сілы выступяць адзіным фронтам. Як аказалася, Партыя БНФ не захацела губляць сваёй аўтэнтычнасці і вырашыла прадстаўляць на Кангрэсе самастойную палітычную сілу.

Пытанне стаяла наступным чынам: ці самому Мілінкевічу стаць часткай БНФ, ці ўзначальваць усе дэмакратычныя, патрыятычныя сілы, часткай якіх і з'яўляецца Партыя БНФ.

Гэта сапраўды праблема, але праблема не фатальная. Мы спадзяемся на добрую волю лідэраў палітычных сіл.

**— Ці сапраўды Аляксандр Мілінкевіч пераманьвае сяброў Партыі БНФ у свой рух? Прынамсі, такія абвінавачанні з боку кіраўніцтва партыі прагучалі...**

— У пагадненні, прынятым Палітычным саветам, гаворка ідзе пра тое, каб на Кангрэсе былі створаны групы, на чале якіх мусяць стаяць пэўныя кіраўнікі. У Мілінкевіча шмат прыхільнікаў, у тым ліку і ў Партыі БНФ. З аднаго боку, многія сябры БНФ падтрымліваюць Мілінкевіча, з другога боку, у святле прынятага на Сойме рашэння быць самастойнымі сябры БНФ мусяць выконваць партыйныя рашэнні. Як быць у такой няпростай сітуацыі? Мы прапанавалі кіраўніцтву БНФ наступнае: мы нікога не будзем пераманьваць, але сябры партыі не прыгонныя, а таму могуць самі вызначыцца, каго і якім чынам падтрымліваць.

Я, да прыкладу, сябра АГП. Калі гаворка ідзе пра партыю, то я цалкам на баку ейнага лідэра — Анатоля Лябедзькі. Але, на мой погляд, Мілінкевіч з'яўляецца больш падыходзячай кандыдатурай у якасці агульнанацыянальнага лідэра. Гэта мая пазіцыя, і я, прынамсі, выступаю за тое, каб шараговыя сябры партый самі вырашалі, каго ім падтрымліваць. Вось пра што гаворка.

**— Якіх рашэнняў Вы чакаеце ад Кангрэса?**

— Выкажу сваю суб'ектыўную думку. Пасля прэзідэнцкіх выбараў шэраг лідэраў памяняў мэты сваёй дзейнасці; многія апазіцыйныя сілы забыліся на рэжым і пачалі змаганне з Аляксандрам Мілінкевічам. Маўляў, нам не патрэбны яшчэ адзін дыктатар, трэба ўзаконіць еўрасаюзаўскі варыянт кіравання — так званае ратацыйнае кіраванне кааліцыяй. Частка палітычных партый не хоча працаваць у кааліцыі.

Я падтрымліваю ідэю Кангрэса, бо менавіта Кангрэс мог бы развязаць гэтую праблему. Але я супраць правядзення Кангрэса любой цаной. Захоўваць ілюзію адзінства няма патрэбы, бо гэтага адзінства не існуе.

**— Чым мусіць завяршыцца Кангрэс дэмакратычных сіл, на Ваша меркаванне? Ці здолее форум "разруліць" супярэчнасці, якія склаліся паміж "правымі" і "левымі", паміж прыхільнікамі Аляксандра Мілінкевіча ў якасці лідэра дэмакратычных сіл і ягонымі апанентамі?**

— Як падаецца мне, розныя суб'екты кааліцыі па-рознаму ставяцца да Кангрэса і ставяць перад ім розныя мэты. Некаторыя хочуць бараніць незалежнасць, іншыя хочуць прымаць "малую Канстытуцыю", хаця дасюль невядома, што гэта такое. Частка настойвае на ўвядзенні ратацыйнага прынцыпу кіравання кааліцыяй. Адзіны здабытак — вызначаная дата Кангрэса. Што мусіць вырашыць Кангрэс — тут адзінства ў суб'ектаў кааліцыі няма. Калі адзін лідэр гаворыць пра нафтагазавы шантаж з боку Расіі, іншы шыкае на яго: не будзі звера, маўляў... Вось такая склалася сітуацыя ў лагеры так званай аб'яднанай апазіцыі.

Перш чым праводзіць Кангрэс, трэба знайсці пагадненне паміж сабой па прынцыповых пытаннях. У адваротным выпадку навошта праводзіць Кангрэс? Для кіраўнікоў палітычных партый, якія прагаласавалі за ратацыйнасць, важна пазбавіць Аляксандра Мілінкевіча статусу.

Я цалкам згодны: лідэраў не выбіраюць, лідэрства не даецца на ўсё жыццё. Апошні Кангрэс, дарэчы, не выбіраў Мілінкевіча лідэрам, яго вылучылі адзіным кандыдатам у прэзідэнты ад дэмакратычных сіл. Пазней была праца тысяч і тысяч людзей, дзякуючы якой сёння Мілінкевіч — чалавек, які мае самы высокі рэйтынг з усіх дзеючых лідэраў апазіцыі. Не такі высокі, як хацелася б, але вышэйшы, чым у іншых. Пытанне стаіць так: каб Мілінкевіч адышоў у бок, як у свой час гэта зрабіў спадар Ганчарык, і не перашкаджаў будаваць іншым дэмакратыю на Беларусі, ці каб гэтая дэмакратыя будавалася на чале з Мілінкевічам? Маўляў, мы рыхтуемся да будучых выбараў — у 2008 годзе, у 2011 годзе. Карацей кажучы, апазіцыя выбрала Кангрэс у якасці формы ўласнага існавання. Маўляў, нам не патрэбны лідэры, нам не патрэбны сімвалы.

**— Як бы Вы ахарактарызавалі расстаноўку сіл напярэдадні Кангрэса?**

— Вызначальным момантам у дзейнасці Палітсавета я б назваў галасаванне па прапанове Уладзіміра Навасяда разгледзець пытанне пра тое, што пагадненне, падпісанае ўвосень Палітсаветам, не выконваецца. Напачатку пагадненне было падпісана, парафіравана, а затым простым галасаваннем у тэкст дакумента ўнеслі змены — у гэты час прадстаўнікоў некаторых суб'ектаў проста не было на пасяджэнні.

Партыя БНФ, камуністы, АГП, Партыя жанчын "Надзея" і аргкамітэт па стварэнні партыі працоўных прагаласавалі супраць прапановы Навасяда, за — я прагаласаваў, Уладзімір Навасяд, прадстаўнік Партыі зялёных. Пазіцыя в.а.старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Анатоля Ляўковіча, які не ўваходзіць у Палітсавет, блізкая да пазіцыі камуністаў. Сярод 12 сябраў Палітсавет цяперашняя расстаноўка сіл размеркавалася прыкладна шэсць на шэсць.

Я супраць Кангрэса любой цаной. Напачатку трэба разабрацца ўнутры апазіцыі, затым выходзіць на правядзенне Кангрэса.

Вось такая мая пазіцыя.

**Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.**

ГУЧНАЯ СПРАВА

## *І будзе суд*

**Справа Канстанціна Лукашова, брата грамадскага актывіста Вячаслава Сіўчыка, перададзена ў суд Ленінскага раёна Мінска. Дата судовага пасяджэння пакуль не прызначана.**

Нагадаем, што Канстанцін Лукашоў быў затрыманы 19 снежня. Паводле наяўнай інфармацыі, яму інкрымінуецца наезд на аўтамабілі на супрацоўніка міліцыі 29 сакавіка мінулага года, калі ён забіраў брата Вячаслава Сіўчыка з аддзялення хірургіі 3-й Клінічнай бальніцы Мінска. У той дзень невядомыя людзі з пасведчаннямі супрацоўнікаў МУС спрабавалі затрымаць грамадскага актывіста пасля яго выпіскі з бальніцы нібыта за дробнае хуліганства, аднак з дапамогай брата Сіўчыку ўдалося з'ехаць.

**Сяргей ПУЛЬША.**

В ТЕМУ

Представители белорусской интеллигенции требуют прекратить незаконное преследование и освободить из-под стражи научного сотрудника Института геохимии и геофизики Национальной академии наук Константина Лукашова.

В заявлении, подписанном в том числе белорусским кинорежиссером и педагогом Владимиром Колосом, народной артисткой Беларуси Зинаидой Бондаренко, академиком Радимом Горецким, членом-корреспондентом Национальной академии наук Иваном Никитченко, художником Алексеем Марочкиным, кинодраматургом Владимиром Халипом и другими, отмечается, что против К.Лукашова заведено политически мотивированное уголовное дело. *"Формальным основанием для его возбуждения стало якобы имевшее место сопротивление ученого действиям милиции,* — говорится в заявлении. — *Мы рассматриваем преследование К.Лукашова как реакцию властей на его активную гражданскую позицию. Она проявилась в выдвижении кандидатуры ученого на выборах в парламент в 2004 году, а также в разработке К.Лукашовым результативной стратегии избрания демократических кандидатов в местные советы. В условиях, когда правовое поле в стране, как шагреневая кожа, сократилось до предела, а правоохранительная система переродилась в репрессивную, К.Лукашову угрожает судебная расправа. Вот почему мы требуем освободить ученого — представителя третьего поколения славной династии белорусских геохимиков",* — подчеркивается в заявлении.

ДОЛГИ НАШИ

## *Беларусь рассчитывает занять за рубежом миллиард долларов*

**Беларусь рассчитывает в 2007 году занять до 1 миллиарда долларов на внешних рынках, чтобы компенсировать повышение цен на российские энергоносители. Об этом агентству "Рейтер" сообщил министр финансов Николай Корбут.**

*"До сих пор наши проблемы решались в основном за счет внутренних источников... Чтобы плавно перенести резкое удорожание энергоресурсов, нам будет нужна в этом году внешняя поддержка в виде привлечения внешних ресурсов",* —- сказал министр финансов.

*"Думаю, мы будем иметь кредитные ресурсы в пределах миллиарда долларов",* — добавил он.

Он сказал, что Минск не планирует привлечения государственных кредитов, однако ведет переговоры о кредитовании с банками России, Великобритании, США, Швейцарии и ряда других стран, рассчитывая на привлечение синдицированных кредитов.

ТАМ, ЗА РЕШЕТКОЙ

## *Даже конфеты вынимали из оберток...*

**Недавно Виктор Казимирович Садовский встретился со своей женой — правозащитницей Екатериной Садовской, которая в течение уже нескольких месяцев находится в Гомельской колонии. Ее посадили на два года за оскорбление президента.**

Свидание было краткосрочным, два часа через стеклянное окно. По словам Виктора Казимировича, все было очень строго. Проверяли конфеты — снимали с них обертки, вынимали вермишель из пакетов. Одета Екатерина Садовская была в куртку и другую тюремную одежду — ничего домашнего нельзя. В октябре муж посылал ей теплые колготы, но их вернули — не положено. В отряде вместе с Екатериной Садовской пятьдесят четыре (!) женщины — все в одном помещении. Подъем — в шесть часов. Днем прилечь нельзя, даже несмотря на болезнь или усталость. Но Садовская сказала мужу, что в колонии к ней относятся хорошо — и администрация, и заключенные. Уважают прежде всего за то, что Екатерине приходит очень много писем — из Америки, Чехии, Нидерландов, Люксембурга, Африки... И Беларуси.

Виктор Казимирович удручен также и тем, что пенсия жены переводится на колонию. Инвалид с одной здоровой ногой (на другой — старенький протез, крепящийся допотопными шурупами) без помощи жены и ее пенсии оказался в стесненном положении. Вы можете ему позвонить и высказать свою поддержку. Телефон в Минске: 283-38-88.

**Людмила ГРЯЗНОВА.**

ГРОМКОЕ ДЕЛО

## *Владимир Браиловский осужден вторично*

**Адвокаты отца могилевского фестиваля "Золотой шлягер" намерены обжаловать приговоры маэстро.**

Бывшему директору Могилевской областной филармонии Владимиру Браиловскому судом Ленинского района Могилева вынесен второй приговор.

Владимир Браиловский — знаковая для области и Беларуси фигура. В свое время он придумал Международный музыкальный фестиваль "Золотой шлягер", на котором выступали звезды советской и мировой эстрады прежних лет. Среди них Муслим Магомаев, Вадим Мулерман, Валерий Ободзинский, Виктор Вуячич, Юрий Антонов, Эдита Пьеха, Аида Ведищева, ансамбли "Самоцветы", "Ялла", "Голубые гитары", "Ариэль", "Машина времени", Тото Кутуньо, Рикардо Фольи и многие другие. Теперь его идея возвращения к слушателю старых песен и их исполнителей подхвачена и плодотворно разрабатывается другими людьми.

Владимир Браиловский был задержан по обвинению в хищении путем злоупотребления служебным положением и осужден в декабре 2005 года к девяти годам лишения свободы в колонии усиленного режима с конфискацией имущества. Маэстро категорически не признал себя виновным.

За время лишения свободы он написал и подготовил к изданию пять книг, в которых рассказывается об организации концертной деятельности, о музыке, есть занимательные истории из личной практики.

В связи с установлением новых фактов в конце прошлого года состоялся второй суд над Владимиром Браиловским. Маэстро по некоторым пунктам обвинения был оправдан, но в итоге обвинен в хищении и приговорен к семи годам лишения свободы.

Адвокаты намерены обжаловать приговор.

**Сергей ГУТАРЕВИЧ,**
*www.bulletinonline.org*

Народная Воля http://www.nv-online.info
9 ЛЮТАГА 2007 г.

АДКРЫТЫМ ТЭКСТАМ

# Самі пажылі б на такую пенсію. Хоць месяц!

*Маючы мізерную пенсію, доўга не працягнеш. Хутчэй выцягнеш ногі.*
*Хто ведае адрас сталоўкі, у якой можна паабедаць за 1,6 тысячы рублёў?*
*Можа, хто здае аднапакаёўку за 48 тысяч рублёў?*
*У каго пенсіі больш за мільён рублёў?*

Нашы ўлады любяць паўтараць, што ў Беларусі добра жывецца пенсіянеру. Вось і днямі Міністэрства эканомікі краіны праінфармавала: “Пенсіённая сістэма рэспублікі функцыянуе стабільна. Забяспечваецца рост і своечасовая выплата пенсій. Сярэднямесячны памер пенсій па ўзросце ў 2006 годзе ў параўнанні з 2005-м павялічыўся на 28,5% (прагноз на 2006 год — 16,5—19,5%) і склаў 259,1 тысячы рублёў, у тым ліку ў снежні — 292,1 тысячы. Сярэднямесячны памер мінімальнай пенсіі па ўзросце павялічыўся на 23,1% (прагноз — на 13,4—14,2%) і склаў 152 тысячы рублёў, у тым ліку ў снежні — 165 тысяч рублёў”.

Мяне, пенсіянера, такія лічбы не радуюць, а хутчэй абураюць. Няхай бы чыноўнікі самі паспрабавалі пажыць на такія грошы. Хоць бы месяц. Але, ведаючы, што яны не здольны нават на такі эксперымент, давайце возьмем аловак і прыкінем, якое жыццё ў пенсіянера.

У снежні, як сказана, сярэдняя пенсія склала 292 тысячы рублёў. А ў паведамленні аб бюджэце пражытачнага мінімуму сказана, што артыкулы яго расходу такія: прадукты харчавання — 50,8%, плата за карыстанне жылым памяшканнем і камунальныя паслугі — 16,4%, прадметы гардэроба — 16,3%, бытавыя і транспартныя паслугі — 7,9%, тавары бытавога і гаспадарчага прызначэння — 3,5%, узносы і плацяжы — 3%, прадметы першай неабходнасці, санітарыі і лекі — 2,1%.

Значыць, палова пенсіі ідзе на харчаванне. Гэта 146 тысяч на месяц, ці 4886 рублёў на дзень, па 1,6 тысячы на сняданак, абед і вячэру. (Тут і далей лічбы акруглены.) Паважаныя чыноўнікі, падкажыце, дзе знайсці ў гарадах сталоўку, у якой можна паабедаць за 1,6 тысячы рублёў. Маўчыце? Што можна наогул купіць за такія грошы? Два стаканы кефіру, паўбатона хлеба і банан. На цыгарэты і жвачку ўжо не застаецца. Пры такім харчаванні доўга не працягнеш. Хутчэй выцягнеш ногі.

Але пойдзем далей. Простыя разлікі паказваюць, што на аплату кватэры і камунальныя паслугі застаецца 47,9 тысячы рублёў. Паважаныя чыноўнікі, у якім ЖЭСе такія невысокія камунальныя плацяжы? Ужо ж аб’яўлена, што плата за двухпакаёўку складае: зімой 122 тысячы рублёў, летам — 74 тысячы. За аднапакаёўку зімой трэба выкласці 81 тысячу. А калі за няўплату камунальных паслуг выселілі з кватэры і трэба здымаць пакой? Хто пусціць за 47,9 тысячы рублёў?

Нельга абысціся без лекаў. Яны неабходны большасці пенсіянераў, на жаль, як ежа і сон. На іх і на прадметы санітарыі, пажылы чалавек можа выдзеліць толькі 2,1% ад атрыманай пенсіі, ці 6134 рублі. Зубная паста, якая сапраўды змагаецца з карыесам, каштуе не менш за 2 тысячы рублёў, ды два кавалкі мыла за тысячу. На лекі застаецца крыху больш за тры тысячы рублёў. А ў пенсіянера 3—4 хваробы, і эфектыўныя лекі ад большасці з іх каштуюць ад 10 да 20 і болей тысяч рублёў. Яму трэба тысяч сорак на месяц на лекі ды яшчэ тысяч дзесяць-дваццаць на добрыя вітаміны.

Нават кароткія разлікі паказваюць, што ў чалавека з такой пенсіяй няма жыццёвай перспектывы. Ён хутка працягне ногі. А можа, на гэта і разлік?

А ёсць жа пенсіі намнога меншыя. Сярэдняя мінімальная пенсія па ўзросце летась склала толькі 152 тысячы рублёў, у тым ліку ў снежні — 165 тысяч рублёў. Гэта значыць у іх атрымальнікаў на абед не 1,6 тысячы рублёў, а менш за тысячу. Вось і даводзіцца нават 70-гадовым і старэйшым падзарабляць, хто як можа (глядзіце здымак).



Праўда, так гаротна жывуць не ўсе пенсіянеры. Прыбліжаныя да ўлады не бядуюць. Тыя, хто пайшоў на заслужаны адпачынак з міністэрстваў, Адміністрацыі прэзідэнта, сілавых ведамстваў, маюць добрыя пенсіі. Вось толькі па радыё, тэлебачанні, у газетах канкрэтныя лічбы не называюцца. Яны схаваны ад народнага вока. Але добра інфармаваныя крыніцы сцвярджаюць, што пенсіі чыноўнікаў і сілавікоў пераваьваюць за мільён рублёў у месяц.

Добра, калі чыноўнік сваёй працай прынёс карысць дзяржаве, але ж мы ведаем, колькі ў нас такіх чыноўнікаў, якія, прабачце, толькі нагавіцы праціраюць.

А скажыце, чаму былы сяржант міліцыі, які фактычна быў звычайным вахцёрам, атрымлівае пенсію большую, чым былы дырэктар прадпрыемства?

Яшчэ прыклад. Сакратар-машыністка спецслужбаў мае пенсію ў некалькі разоў большую, чым былая работніца фабрыкі альбо даярка калгаса. Яна што, у баявых аперацыях удзельнічала, жыццём рызыкавала?

Аляксандр Лукашэнка не раз казаў, што ў нас сумленная ўлада, якая клапоціцца пра народ. Калі так, дык няхай абнародуюць памеры пенсій згаданых вышэй чыноўнікаў і іншых асоб, прыбліжаных да ўлады. Пры сумленнай уладзе пенсіі разлічваюцца па справядлівых крытэрыях для ўсіх. Такі парадак у заходніх краінах. Чаму ў нас інакш: хто служыць уладзе — таму болей, усім астатнім — што застаецца?

Чаму ў нас прамыслоўцы і хлебаробы, якія ствараюць матэрыяльныя каштоўнасці і вырошчваюць прадукты харчавання, атрымліваюць у 3—4 разы меншыя пенсіі, чым чыноўнікі, якія нярэдка перакладваюць паперкі і ствараюць цяжкасці ў рабоце працаўнікоў? У тым, што не хапае грошай на добрыя пенсіі, што слаба развіваецца эканоміка, вінаваты найперш упраўленцы. Дык за што ім лепшую пенсію? Калі б мелі такую, як усе, тады, мабыць, і ўвіхаліся б лепей?

**Аляксей Мікалаевіч КУНЦЭВІЧ, пенсіянер, жыхар г.Мінска.**

**АД РЭДАКЦЫІ**

*Пенсіённая тэма хвалюе мільёны людзей. І “Народная воля” запрашае чытачоў да сур’ёзнай, глыбокай дыскусіі.*

*Пішыце, калі ласка, вашы лісты, вашы меркаванні і прапановы знойдуць месца на старонках газеты.*

КОРОТКО

## Вот получим кредитный рейтинг...

Беларусь получит суверенный кредитный рейтинг во втором квартале 2007 года, сообщил журналистам председатель правления Национального банка Беларуси Петр Прокопович. Он отметил, что позиция гавного банковского учреждения страны остается неизменной: чем раньше мы его получим, тем лучше. Как проинформировал Петр Прокопович, этот “процесс уже на финише”.

Получение кредитного рейтинга необходимо для эффективной работы банков на международном рынке, а также экономики в целом.

Наличие рейтинга позволит Беларуси приоткрыть двери на мировой рынок капитала. Кроме того, в случае его получения, даст возможность местным коммерческим банкам получить более высокий рейтинг, что в свою очередь поможет им в доступе к источникам более дешевого финансирования.

Правда, эксперты задают вопрос, а какого качества будет этот рейтинг? И сходятся во мнении, что рассчитывать на приличный уровень не приходится.

## Более чем в два раза

Выросли за 2006 год объемы реализации пассажирской техники Минского автомобильного завода. Так, если в 2005 году автобусные парки Беларуси приобрели 353 автобуса, то в минувшем году — уже 777.

Всего же в прошлом году МАЗ изготовил 1692 автобуса, что на 60,6 процента больше, чем в предыдущем. Реализовано за тот же период 1678 автобусов (рост — 66,5 процента). В 2007 году автозавод планирует увеличить производство и реализацию пассажирской техники до 1800 единиц.

ЭКАНАМІЧНЫ АГЛЯД

# Бывай, халява!

*Сельскай гаспадарцы патрабуюцца трыльёны рублёў. Дзе іх узяць?*



За акном снег і завеі, а думкі хлебароба пра вясну і сяўбу. Рамонт тэхнікі, нарыхтоўка ўгнаенняў і паліва... Не толькі гэта турбуе цяпер. Найперш тое, якой яна будзе, сёлетняя сяўба? Новыя, высокія цэны на расійскія энерганосьбіты вымушаюць хлебароба моцна моршчыць лоб у пошуку выйсця са складанай сітуацыі.

Наша сельская гаспадарка і ў папярэднія гады сядзела на дзяржаўнай датацыі. Штогод аграпрамысловы комплекс атрымліваў дзяржаўнай падтрымкі ў памеры 3 трыльёны рублёў. Прычым апошнія дватры гады яна была значна большай, чым 3—4 гады таму.



А як быць цяпер? Павышэнне цэн на нафту і газ, безумоўна, негатыўна б’е па эканоміцы сельскай гаспадаркі. Больш дарагімі ўжо сталі паліва, гаруча-змазачныя матэрыялы, мінеральныя ўгнаенні. Па папярэдніх прыкідках, павышэнне цаны толькі на газ абыдзецца нашаму аграпрамысловаму комплексу прыкладна ў трыльён рублёў.

Дзе ўзяць такія сродкі? 3 трыльёны рублёў ранейшай дзяржпадтрымкі, на якую спадзяецца вёска і без якой яна не абыходзілася ў папярэднія гады, ды яшчэ трыльён патрэбен у сувязі з павышэннем коштаў на газ. І гэта ў той час, калі ў дзяржаўнай казне катастрафічна не хапае сродкаў з-за новых цэн на энерганосьбіты.

Як жа збіраюцца вырашаць такую нялёгкую задачу? Ад падтрымкі сельскай гаспадаркі ніхто не адмаўляецца нават у цяперашніх складаных умовах. Аб гэтым заявіў днямі на пасяджэнні калегіі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання віцэ-прэм’ер Іван Бамбіза. Толькі сродкі з фонду падтрымкі сельгасвытворцаў у асноўным пойдуць на закупку мінеральных угнаенняў і паліва, тэхнічнае пераўзбраенне малочна-таварных ферм, жывёлагадоўчых комплексаў і набыццё новай тэхнікі.

Прыйдзецца паднатужыцца і самім гаспадаркам і іхнім кіраўнікам і спецыялістам. Па думцы віцэ-прэм’ера Івана Бамбізы, патрэбна правесці аўдыт усёй энергагаспадаркі аграпрамысловага комплексу, праверыць эфектыўнасць работы ўсіх энергаўстановак. Па яго словах, на прадпрыемстве АПК укаранёны энергазберагаючыя тэхналогіі і новае абсталяванне, якія дазваляюць у дзесяткі разоў скараціць энергетычныя затраты. Асабліва гэта датычыцца выкарыстання газавага, вадкапаліўнага абсталявання і пераводу яго на мясцовыя віды паліва.

Разам з тым, ён звярнуў увагу на тое, што яшчэ не ўсе кіраўнікі гаспадарак зразумелі ўсю сур’ёзнасць моманту, што трэба вучыцца жыць і працаваць у новых умовах гаспадарання, найперш эканоміць энергарэсурсы. Так, выкуплены далёка не ўсе агрэгаты, якія працуюць на мясцовым паліве і выраблены па заказе АПК. А ў Гомельскай вобласці прыдбалі толькі палову іх.

Думаецца, што заклік працаваць па-новаму ў новых умовах, датычыцца не толькі кіраўнікоў сельскіх гаспадарак, але і кіраўніцтва ўсяго аграпрамысловага комплексу і краіны. Ну як разумець такія факты? Летась было завезена 26 тысяч тон таматаў, 1,8 тысячы тон агуркоў з цяпліц. Няўжо тыя ж агуркі не растуць у беларускіх цяпліцах? Летась завезена таксама 13 тысяч тон крухмалу. І гэта ў той час, калі ў краіне лішкі бульбы, якой, каб зусім не прапала, кармілі жывёлу. Нямала завозіцца круп, найперш грэчкі, з Расіі і Украіны, хаця іх можна вырошчваць у сваёй краіне. І валюту сэканомілі б, і свае гаспадаркі мелі б дадатковы даход.

І, вядома ж, варта лепей выкарыстоўваць сродкі. Большасць гаспадарак, атрымаўшы дзяржаўную падтрымку, не выконваюць сваіх абавязкаў перад дзяржавай. Заўважце, большасць. То навошта даваць ім тую падтрымку? І чаму ніхто не адказвае за разбазарванне дзяржаўных сродкаў? Ва ўсякім разе аб гэтым штосьці не чуваць.

Так далей жыць не атрымаецца. У наступныя гады цэны на энерганосьбіты будуць расці, значыць, будзе яшчэ цяжэй. Халява скончылася.

**Яўген ТАЎГЕНЬ.**

А ЯК НА ЗАХАДЗЕ?

# Свежыя ягады круглы год

У час шматлікіх вандровак па Германіі мне давялося не раз сустракацца з пенсіянерамі і нават пажыць у іх сем’ях.

...Мы селі ў легкавік, і яго гаспадар Ганс спярша ўключыў музыку, пасля матор. Пачулася мелодыя бадзёрага маршу, і мы выкацілі на гарадскую вуліцу. Шафёр з натхненнем стаў падпяваць, яму дапамагала жонка Анеліза. Ганс адной рукой трымаў руль, а другой натхнёна дырыжыраваў у такт мелодыі.

Мы ехалі ў яго горад Бергкамен, куды ён запрасіў мяне пагасцяваць. Бергкамен — невялікі гарадок, як наш райцэнтр. У асноўным трохпавярховыя і двухпавярховыя асабнякі. Да аднаго з іх мы і пад’ехалі.

З Гансам жыла сям’я яго сына з трох чалавек. Яна займала другі паверх. У доме на пяць чалавек 10 пакояў, дзве кухні, тры санблокі з ваннай, душам і туалетам і яшчэ адзін, чацвёрты, гасцявы туалет.

Ганс і Анеліза — пенсіянеры. Грошай хапае. Гаспадыня штодня ездзіць на веласіпедзе за прадуктамі ў магазін. Гэта займае паўгадзіны. Ды сочыць за чысцінёй у хаце. Гаспадар наведвае рэпетыцыі хору. У вольны час, якога хапае, садзяцца ў легкавік і кацяць у госці да сяброў, альбо на канцэрт ці за пакупкамі ў горад Дортмунд, да якога каля дваццаці кіламетраў.

Дома мы толькі снедалі. Сняданак такі — двух-трох гатункаў каўбаса, сыры, масла, чай ці кава і шмат зеляніны і ягад. Быў май, а мы штодня елі клубніцы. Іх самалётамі прывозілі з Іспаніі. Мае гаспадары пераконвалі, што свежыя ягады пенсіянерам трэба есці круглы год.



Аднойчы днём прагуляліся па гарадку. У скверы прыселі насупраць нейкай дзіўнай сцяны, з якой журчала вада. Ганс паведаміў, што яна зроблена з бярозавых сучкоў, а абліваецца мінеральнай вадой. Тут трэба двойчы на тыдзень пасядзець хвілін дваццаць, гаварыў ён, гэта добрыя лекі ад астмы і ад прастудных захворванняў. Хутка мы адчулі свежы водар. Пакідалі сквер бадзёрымі, нібы пасля купання.

Побач — комплекс басейнаў. Толькі на вуліцы аж тры, у якіх плюхаліся купальшчыкі. У адным басейне тэмпература вады заўжды такая, як у тутэйшай рацэ. У другім — 26 градусаў, у трэцім — трыццаць. Выбірай любы. У кожным можна прыняць масаж пад вадой. Трэба толькі націснуць кнопку.

Мае гаспадары добра адклікаліся аб грамадскай арганізацыі “Меннерарбайт” Евангельскай царквы Вестфаліі, якая ладзіць шэраг мерапрыемстваў для пенсіянераў, такія як вечары адпачынку, семінары па актуальных праблемах жыцця, паездкі ў Беларусь, Іспанію, на бераг Паўночнага мора...

Яшчэ раней, у час наведвання Бона, у гасцініцы я звярнуў увагу на шматлікую групу пенсіянераў з канспектамі. Аказалася, яны сабраліся тут з усёй акругі на заняткі універсітэта бабуль і дзядуль. Іх вучылі, як наладзіць добрыя ўзаемаадносіны з унукамі. Многія з радасцю расказвалі, як гэта ім дапамагае ў жыцці.

Такое змястоўнае жыццё пенсіянераў забяспечвае добрая пенсія, якая складае 70 працэнтаў ад заробку. Сярэдняя пенсія ў Германіі — 1150 еўра. Яе хапае не толькі на паўнацэннае харчаванне, лекі, вопратку, але і на замежныя паездкі. Многія пенсіянеры ў год двойчы выязджаюць за мяжу, адпачываюць у Іспаніі, Тайландзе і іншых кропках свету.

З гадамі здароўе пагаршаецца, патрэбен большы догляд за пенсіянерам, а значыць, трэба мець болей сродкаў. Калі пенсіі на гэта не хапае, чалавеку выдаецца дадатковая дапамога па старасці. За яе можна наняць чалавека ці медработніка, які будзе даглядаць пажылога. У выніку, дзеці могуць спакойна працаваць, ведаючы, што бацькі пад наглядам. Лепш на душы і ў пажылых — яны не вымушаюць дзяцей круціцца паміж работай і імі.

Вядома, і ў іх хапае праблем. Апошні час у сувязі з пагаршэннем спраў у эканоміцы краіны і звязаных з гэтым рэформ распачата абмежаванне сацыяльных заваёў. У прыватнасці, урад вырашыў знізіць памер пенсій з 70 працэнтаў заробку да 67. Гэта выклікала хвалю незадаволенасці, і рэйтынг канцлера істотна панізіўся. Пачаўся дыялог з грамадскасцю ў пошуку кампрамісу.

Больш шасцідзесяці гадоў таму нашы і германскія гарады ляжалі амаль у аднолькавых руінах пасля той разбуральнай вайны. І мы, і немцы пачыналі амаль з нуля, на папялішчах новае жыццё.

І якім розным пабудавалі яго! Гэта яскрава бачна па тым, як жывуць франтавікі і іх дзеці ў Беларусі і Германіі.

**Сяргей ПЯТРОЎ.**

КОРОТКО

## Надеются, что спишут

Гомельской области своевременно не вернули кредитов более чем на 190 млрд рублей. Такую цифру, по информации БелаПАН, назвал на заседании облисполкома его председатель Александр Якобсон.

Он заявил, что некоторые руководители по-прежнему надеются, что кредиты будут списаны. Однако в связи с увеличением цен на энергоносители в бюджете нет средств, чтобы их погасить. Рассчитывать, что кредиты будут списаны, не приходится. Их придется все равно возвращать, подчеркнул А.Якобсон.

## Объем — 6 процентов, а доля выручки — 21

За девять месяцев 2006 года субъектами малого предпринимательства было произведено: 6,2% общего объема производства продукции (работ, услуг промышленного характера); 8,8% общего объема розничного товарооборота; 15,0% объема экспорта товаров; 31,6% общего объема импорта товаров. А доля малого предпринимательства в общем объеме выручки от реализации продукции, работ, услуг по народному хозяйству за январь—сентябрь 2006 года составила 21%.

По состоянию на 1 января 2007 года количество индивидуальных предпринимателей составило 191,8 тыс человек. За 2006 год их число увеличилось на 13,9 тыс Сумма налоговых поступлений от индивидуальных предпринимателей составила 646,8 млрд рублей и увеличилась за 12 месяцев 2006 года на 119,5 млрд рублей.

УРОКИ

## Нефть в Германию: сколько и откуда?

Ежегодно Германия ввозит 112 миллионов тонн нефти. Основной экспортер этого сырья в ФРГ — Россия. Она поставляет в Германию 30 процентов нефти, а также 37 процентов газа, 19 процентов урана и 8 процентов угля.

Вторым по значимости поставщиком нефти в Германии является Норвегия (16%). Кроме того, ФРГ импортирует нефть из Ливии (12%), Великобритании (11%), Казахстана (7%), Сирии (3%) и Саудовской Аравии (3%).

### МИНИ-КОММЕНТАРИЙ

Как видим, Германия покупает нефть у многих стран. А наша страна получает нефть и газ только из России. Хотя в мире давно известно, что получать любые товары, тем более энергоносители, необходимо как минимум из 3—4 источников. Иначе монополисты могут загнуть такие цены!.. Вот Беларуси “Газпром” и загнул.

Оппозиция давно предупреждала власти, что не стоит так сильно привязываться к одной стране. Но они и слушать не хотели, более того, обрушивались с репрессиями на нее и независимую прессу. В последнее время, похоже, стали понимать суть проблеммы. Но как дорого обходится стране их учеба!

**Сергей ИВАНОВ.**

Народная Воля http://www.nv-online.info
9 ЛЮТАГА 2007 г.

## У СОСЕДЕЙ

# О чем спорят в Украине?

**В Украине новый закон о Кабинете министров обернулся политическим кризисом и судебным разбирательством.**

Этот документ передает часть функций от президента парламенту. И президент страны Виктор Ющенко с таким воплощением политической реформы категорически не согласен. Он внес представление в Конституционный суд о законе "О Кабинете министров", считая его неконституционным, так как впервые в истории страны вступил в силу закон, подписанный не президентом, а Верховной Радой.

*"Я обращаюсь в Конституционный суд о неконституционности закона о Кабинете министров по форме и по содержанию"*, — сказал Ющенко журналистам. Правительство страны *"работать с фальшивым паспортом не может"*, заявил он.

Ранее парламент Украины преодолел вето президента и принял закон о Кабинете министров, не поддержав ни одной из 42 предложенных главой государства поправок. Ющенко вернул закон в Раду со своими предложениями, мотивируя это тем, что поступивший ему на подпись документ отличается от утвержденного парламентом.

На днях в Киеве прошла встреча трех первых лиц государства. После переговоров премьер-министр Украины Виктор Янукович и спикер Верховной Рады Александр Мороз согласились поправить некоторые положения закона. Виктор Янукович, премьер-министр Украины: *"Есть примерно восемь статей закона о Кабинете министров, по которым у президента и парламента разные позиции. Вокруг них, собственно, и идет дискуссия. В частности, статьи о назначении в парламенте премьер-министра, министра обороны и министра иностранных дел президент оспаривает в Конституционном суде. Если парламент вернется к этим статьям и снимет разногласия, президент свое представление из суда отзовет. Иначе все будет решено именно в судебной плоскости"*.

**Игорь СМИРНОВ.**

# Кандидатов — шестеро

*В воскресенье в Туркмении пройдут выборы президента*




Гражданам страны предстоит решить, кто станет преемником покойного Туркменбаши, который стоял во главе республики 21 год. Туркменскому народу предстоит впервые выбирать главу государства на альтернативной основе под присмотром международных наблюдателей.

Кандидатов — шестеро. Среди них, помимо и.о.президента Гурбангулы Бердымухаммедова, замминистра нефтегазовой промышленности и минеральных ресурсов Ишанкули Нурыев, мэр города Абадан Оразмурат Караджаев, мэр города Туркменбаши Ашириняз Помманов, первый заместитель главы администрации Дашогузской области Аманнияз Атаджиков и глава Карабекаульского района Лебапской области Мухаммедназар Гурбанов.

Но, по мнению большинства наблюдателей, реальные шансы на победу есть только у одного из них — исполняющего обязанности президента Гурбангулы Бердымухаммедова. Он обещает перемены: снять запрет на использование Интернета, вернуть десятилетнее образование и восстановить пенсионное обеспечение. Правда, кандидатом он стал в нарушение конституции, в которую пришлось срочно вносить изменения.

На выборы приехали и эксперты ОБСЕ. Однако они не будут осуществлять наблюдение за выборами и их мониторинг, так как в связи со сжатыми сроками не было возможности подготовить группу для выполнения этих функций. Публичный отчет со стороны также не предусмотрен.

Группа поможет центру ОБСЕ в Ашхабаде следить за избирательным процессом. Запланированы встречи экспертов с представителями государственных органов, ответственных за организацию выборов, с кандидатами в президенты, организациями гражданского общества.

На заседании Кабинета министров и.о. президента Туркмении Гурбангулы Бердымухаммедов отметил, что выборы необходимо провести на высоком организационном уровне, в обстановке полной открытости и гласности. Для этого на всех каналах туркменского телевидения постоянно демонстрируются учебно-агитационные видеоролики о порядке и процедуре голосования, правилах заполнения избирательных бюллетеней.

Власти Туркмении в преддверии выборов начали работы по сносу нескольких блоков самой охраняемой в республике тюрьмы — Овадан-Депе, ожидаются также преобразования в системе тюрем и психиатрических лечебниц закрытого типа. По сообщению "Немецкой волны", в Совете безопасности Туркмении рассматривается возможность пересмотра дел политических заключенных, дабы ослабить давление со стороны международных правозащитных организаций и Запада.

На днях сделан первый шаг. Из тюрьмы Овадан-Депе, куда при первом президенте республики Сапармурате Ниязове отправляли оппозиционеров и попавших в опалу чиновников, отпущены несколько человек, сообщает ИА "Фергана.Ру". По данным агентства, эти люди — в прошлом члены правительства — переведены под домашний арест. Между тем ИА "Фергана.Ру", комментируя эту информацию, отмечает, что делать выводы о возможной либерализации режима в Туркмении пока преждевременно.

**Иван ВАСИЛЬЕВ.**

## КОРОТКО

# В Европу пришел птичий грипп

*"Нужно, чтобы журналист говорил о каждой политической силе правду, если мы хотим сделать благо Украине,* — сказал Ющенко во время одного из своих выступлений. — *Но я понимаю, что это делается не призывом президента, а ежедневным ответом, кто есть кто в Украине. С каким душком, с какими ценностями, как живет его семья, где его дети, какие мобилки они носят, какие часы?... Я бы хотел, чтобы мы говорили в этой стране правду".*

Что ж, может, и мы доживем до тех времен, когда можно будет говорить правду и с экрана телевизора, и в государственных газетах...

**Марина КОКТЫШ.**

---

# *Медыкі выратавалі Сяргею Законнікаву руку*

**Нядаўна вядомы беларускі паэт перанёс складаную аперацыю.**

*"Ён парваў мышцу на руцэ і сухажылле таксама,* — распавяла "Народнай волі" жонка Сяргея Законнікава. — *Па гаспадарцы нялоўка падняў картонную скрыначку кілаграмаў дзесяць вагой. А па маладосці плячо было траўміравана ў аўтааварыі, вось пашкоджаная мышца і не вытрымала...*

*Доктар сказаў, што на рэабілітацыйны перыяд спатрэбіцца месяца паўтара. І цяпер руку трэба берагчы, бо калі нешта скранецца, то прыйдзецца рабіць новую аперацыю".*

Пасля аперацыі Сяргей Законнікаў адмовіўся ад абязбольвальных.

*"Яму адзін укол слабенькі ўшпілілі, але адразу сэрца схапіла — яно ў Сяргея Іванавіча крыху барахліць,* — гаворыць жонка паэта. — *І аперацыю з-за гэтага прыйшлося рабіць пад мясцовым наркозам. І першыя дні пасля хірургічнага ўмяшальніцтва прыйшлося патрываць. Так што ён у мяне герой!..*

*Дзякуй Богу, што рука левая. Рабочая рука ў страі".*

"Народная воля" зычыць Сяргею Іванавічу хутчэйшага выздараўлення!

**Аліна ВЕТРАВА.**

---

АНОНС

# *«Atlantica» запрашае на канцэрт*

**8 Сакавіка ў канцэртнай зале "Мінск" адбудзецца першы сольны канцэрт папулярнай і, бадай што, самай паспяховай беларускай групы.**

Упершыню група прадстане перад гледачамі ў пашыраным складзе. Усе кампазіцыі будуць прадстаўлены толькі ў жывым выкананні — у суправаджэнні гітар, баса, ударных і клавішных.

*"Мы вырашылі не ісці па шляху клубных прэзентацый, а адзначыць выхад новага дыска вялікім сольным канцэртам,* — гаворыць лідэр "Atlantica" Alex David. — *Мы выканаем песні з новага альбома, а таксама ўсе самыя вядомыя хіты".*

Дарэчы, білеты на канцэрт ужо прадаюцца.

---

КИНОВЕСТИ

# «9-ю роту» вывели из строя

Кинематографический мир в ожидании: 25 февраля в Театре Кодак в Лос-Анджелесе состоится 79-я церемония вручения премии Оскар.

Некоторые киноленты, вошедшие в число номинантов в разных категориях, минские зрители уже имели возможность видеть: ***"Отступники"*** **Мартина Скорсезе**, *"Лабиринт Фавна"* **Гилермо дель Торо**, *"Дьявол носит Прада"* **Дэвида Френкела**, анимационную ленту *"Делай ноги"*. А другие еще будут демонстрироваться в Минске в различных программах. В частности, приключенческая комедия с элементами драмы *"Маленькая мисс Счастье"* **Джонатана Дэйтона** и **Валери Фэрис** включена в февральскую афишу — она войдет в кинопоказ "Киноформат 4х4", который состоится *15—18 февраля*. В Доме кино намечен показ фильма *"Вавилон"* **Алехандро Гонсалеса Иньяриту** (на "Оскаре" фильм заявлен в 7 номинациях).

А вот *"9-ю роту"* **Федора Бондарчука** вывели из строя претендентов на золотую статуэтку. На этот раз звезды и голоса киноакадемиков США сошлись не в пользу Бондарчука-младшего...

Кстати, сейчас пишут о том, что **Сергей Бондарчук**, получивший в 1968 году "Оскара" за *"Войну и мир"*, был первым советским режиссером, награжденным американской кинопремией. Однако первый "Оскар" еще в 1942 году получили **Леонид Варламов** и **Илья Копалин** за полнометражный документальный фильм *"Разгром немецко-фашистских войск под Москвой"*, созданный на основе съемок фронтовых кинооператоров.

Еще одно уточнение. В советском "Кинословаре" 1986 года значится, что обладателем "Оскара" в 1944 году был известный режиссер **Марк Донской**, создатель трагического военного фильма "Радуга". Однако это также ошибка. Донского за "Радугу" наградили высшим призом Ассоциации кинокритиков США и премией газеты "Дейли Ньюс".

На территории нашего бывшего отечества после С.Бондарчука "Оскара" удостоены японский режиссер **Акира Куросава,** поставивший в СССР фильм *"Дерсу Узала"* (по итогам 1975 года), и **Владимир Меньшов** за мелодраму *"Москва слезам не верит"* (1980 год). В новой России первым "оскароносцем" стал **Никита Михалков** (*"Утомленные солнцем"*, 1994 год).

# Переполох из-за Бората




У этого фильма длинное название: *"Борат: исследование американской культуры на благо великой казахской нации".* Сначала лента вызвала скандал в США, потом в Англии, а в конце минувшего года ажиотаж начался и в России. Ряд российских средств массовой информации сообщили, что правительство Казахстана якобы закупило в "Нью-Йорк Тайм" полосу для опровержения, а **Рахат Алиев**, зять **Нурсултана Назарбаева**, будто бы пригласил американцев и режиссера фильма на родину, чтобы убедиться в цивилизованности казахов.

Слухи я решила проверить у коллеги из Алматы, но пока ответа нет, хотя из других источников знаю, что и в Астане, и в бывшей казахской столице о проделках кинематографического Бората судачили на всех правительственных и общественных уровнях.

Кто же этот Борат? По версии постановщика фильма, **Борат Сагдиев** — казахский репортер, приехавший с продюсером в Америку снимать документальный фильм об американцах как о самой культурной и самой толерантной нации (по сюжету). Прибыв в Нью-Йорк, недотепистый азиат-журналист с курицей в чемодане попадает в щекотливые ситуации — то кидается в объятия сильного пола, то демонстрирует за столом переработанные продукты своего желудка. Влюбившись в **Памелу Андерсон,** Борат едет в Лос-Анджелес, чтобы жениться на голливудской кинодиве. В предфинальном эпизоде он набрасывает ей на голову мешок, предварительно уведомив, что ее согласия на свадьбу не требуется.

Картина снята в жанре путешествия-репортажа. Видно, что какие-то эпизоды документальны, какие-то сыграны, а в целом тут много чего наворочено и собрано в единую кучу — от политического хулиганства до межрасовой провокационности, от остроумной насмешки в некоторых эпизодах до юмора ниже пояса. Фильм пародирует сознание той части американцев, которые все еще живут допотопными представлениями о Востоке и Восточной Европе (недаром Борат путешествует с медведицей).

А кто же создатель этой кинокатавасии, взбудоражившей политиков и культуртрегеров? Режиссер фильма **Саша Бэрон Коэн** — британец. По образованию историк (окончил Кембридж). Вел различные шоу-программы на британских телеканалах. Примерно три года назад он начал идентифицировать себя с придуманным персонажем — казахом **Боратом Сагдиевым** не только на ТВ, но и в жизни. Наконец, снял фильм, появившись в роли Бората на киноэкране.

Несколько недель назад Ассоциация иностранной прессы Голливуда отметила Коэна-Бората премией "Золотой глобус" (лучшая мужская роль в жанре комедии и мюзикла).

Федеральное агентство по культуре и кинематографии России пока не выдало разрешительного удостоверения на прокат фильма в кинотеатрах, но на DVD он разрешен. А какой смысл в запрете? Только масла в огонь подлили, и теперь, как и за триллером *"Код да Винчи"*, поспешно изъятым из кинотеатров Минска, за Боратом будут гоняться даже те, кто до запрета и скандалов не проявил бы интереса.

Последние сообщения российских СМИ: американцы оформляют визы в Казахстан и меняют доллары на казахские теньге.

**Алла БОБКОВА,**
**кинокритик.**

---

АНОНС

# *Цветок февраля*



**Минск готовится посетить экзотический во всех отношениях цветок — одесская группа "Fleur".**

Название группы интерпретируется по-разному: и от французского "fleur" — цветок, и от немецкого "Flor" — полупрозрачный покров. Все эти толкования в той или иной мере верно определяют атмосферную "Fleur". Не зря и стиль группы сами участники очень емко назвали "cardiowave" — волна, идущая от сердца. Характерной особенностью их фирменного звучания является сочетание электронного звучания с живыми, чаще акустическими инструментами. Внимания заслуживают также и потрясающие своей проникновенностью тексты группы.

Группа "Fleur" была создана в 2000 году в Одессе. Ядро и идейный центр этого коллектива составляют две очаровательные девушки — **Ольга Пулатова** (фортепиано, вокал, автор песен) и **Елена Войнаровская** (гитара, вокал, автор песен). При помощи флейты, виолончели, контрабаса и атмосферных клавиш группе удалось добиться поразительного эффекта — узнаваемый стиль и почти осязаемая одухотворенность музыки выделяют одесских чародеек из сонма команд андерграундного мира.

На данный момент группа выпустила четыре альбома и сняла несколько клипов. В апреле—мае 2006 года группа совершила свой первый большой тур по Украине и России в поддержку четвертого альбома "Все вышло из-под контроля". Первый же приезд одесситок в Москву в апреле 2006 года превзошел все, даже самые смелые, ожидания — буря откликов в СМИ и забитые до отказа залы сделали "Fleur", по версии газеты "Ведомости", *"самым громким открытием 2006 года".*

25 февраля в клубе "Step" состоится первое выступление одесской группы "Fleur" в Минске. Основу программы составят композиции из последнего релиза группы, который белорусы даже в записи практически не слышали. На этот раз на одной сцене с "Fleur" будет играть и белорусская нео-фольк-рок-группа "Рокаш". Многочисленные выступления группы проходят на ура, потому что лиричность фольклорных мелодий дополняется драйвом и энергетикой, которой молодые музыканты щедро делятся с публикой.

**Ольга ПРУДНИКОВА.**

*Место проведения: клуб "Step". Стоимость билетов: 25 тысяч, VIP-места — 35—45 тысяч белорусских рублей.*

---

ТАК И СКАЗАЛ

## ***Павел КОРЕНЕВСКИЙ,*** *заместитель генерального директора ЗАО "Столичное телевидение":* ***«Наши звезды без понтов»***

### О вызывающем поведении

*"...Некоторые российские звезды, которые приезжают к нам с концертами, иногда ведут себя просто отвратительно. Гораздо приятнее общаться с белорусскими звездами эстрады — они добрее, ровнее и без понтов",* — отметил один из руководителей телеканала СТВ во время пресс-конференции, посвященной авторскому проекту певицы **Искуи Абалян *"Это просто любовь",*** который, как уже сообщала "Народная воля", состоится 13 февраля во Дворце Республики. Телеверсию концерта, посвященного Дню всех влюбленных, покажут на СТВ 14 февраля.

### О больших деньгах

Ежегодно бюджет белорусских телеканалов по некоторым параметрам увеличивается почти в два раза. Этот факт удивляет даже некоторых чиновников Министерства информации.

Отвечая на вопрос о том, как будет декорирована сцена Дворца Республики во время концерта **Искуи Абалян,** Кореневский попытался мимоходом объяснить, куда тратятся деньги.

По его словам, только за декор сцены на реалити-шоу "Звездный цирк" конкурентам СТВ пришлось выложить *"примерно 100 миллионов рублей". "А на декорацию сцены на фестивале "Славянский базар", где в день проходит огромное количество концертов, тратится примерно 100 тысяч долларов",* — сравнил Кореневский.

**Марина ВИШНЕВСКАЯ.**

---

ШОУ-БІЗНЕС

# *Сонца вакол гурта «Indra»*

**Полацкі рок-гурт "Indra" нядаўна запісаў свой першы альбом. Ён перамог у інтэрнэт-конкурсе сярод беларускамоўных гуртоў "Зваротны адлік-2006", які праводзіла "Еўрапейскае радыё для Беларусі" супольна з радыё "Polonia".**

Альбом называецца "Сонца вакол".

*"Чаму? Самі зразумееце, калі паслухаеце!"* — таямніча ўсміхаюцца дзяўчаты.

На дыску 9 песень, напісаных на вершы **Леры Сом, Паўла Сляшчова** і **Наталлі Клімавай.** Таксама ў альбом уключана кавер-версія кампазіцыі "Мясцовага часу" "Шлях дамоў", якую "Indra" выканала на мінулым "Рок-коле".

У першыя выхадныя сакавіка адбудзецца прэзентацыя альбома ў Полацку з удзелам гурта "Ulis" і мінскага "Рэха". А ў хуткім часе дыск можна будзе свабодна набыць.

Гурт "Indra" існуе ўжо чатыры гады. Сярод галоўных дасягненняў — прыз за найлепшы вакал на фестывалі "Рок-кола-2004" і трэцяе месца на "Рок-коле" ў 2005 годзе. Склад гурта: **Вольга Андрэева** *(вакал)*, **Марына Шэф** (*гітара*), **Галіна Сандова** (*віяланчэль*), **Павел Кухто** (*бубнач*).

Дарэчы, "Indra", змяніўшы каля пятнаццаці басістаў, зараз знаходзіцца ў пошуку новага музыкі для калектыву.

**Вальжына КОРСАК.**

---

ПРЫВАТНАЕ ЖЫЦЦЁ

## *Ганна ЛАЎРУКЕВІЧ:*

# «Быт каханню не перашкода...»

*Аб асабістым у быце рэпарцёр "Народнай волі" паразмаўляла з гендырэктарам Беларускага дзяржаўнага аб'яднання арганізацый бытавога абслугоўвання ("Белбыт") Ганнай Лаўрукевіч.*

**— Ганна Мікалаеўна, як чалавек, для якога быт даўно стаў працай, як Вы ставіцеся да выразу *"Сямейны човен разбіўся аб быт"*?**

— Я лічу, што калі ёсць каханне, то нічога ніколі не разаб'ецца. Сапраўдныя пачуцці пад уздзеяннем складаных абставін могуць ахладзець, але калі ёсць сапраўднае каханне, то гэта ненадоўга. Бясспрэчна, вельмі добра, калі з самага пачатку сямейнага жыцця ёсць кватэра, машына, прэстыжная і любімая праца (на мой погляд, праца з'яўляецца галоўным для чалавека). Але калі няма кахання, усё пойдзе прахам. Не выратуюць нават вялікія грошы. Не дарэмна ж кажуць, што з каханым рай і ў шалашы. Мабыць, гэта не матэрыяльны рай, але рай кахання. А што тычыцца бытавых праблем, то ў жыцці ўсе праходзяць праз пэўныя складанасці...

**— Вам, як дзелавой жанчыне, напэўна, прыходзілася ахвяраваць сям'ёй дзеля працы...**



— Так, я заўсёды прыносіла ў ахвяру сваю сям'ю. Спачатку вучылася, потым працавала і на нарадах бывала часцей, чым дома...

**— І як на гэта рэагавалі і рэагуюць Вашы родныя?**

— Я ніколі не спрабавала штосьці ад іх скрываць, заўсёды прама гаварыла, як многа значыць для мяне мая праца. І яны, дзякуй Богу, мяне разумеюць. Я ніколі не пісала з дачкой кручочкі і не рашала задачкі — яна вучылася поўнасцю самастойна. Я прыйшла да яе ў школу і ўпершыню ўбачыла яе класнага кіраўніка толькі на выпускным. Але пры гэтым яна вучылася на "пяцёркі", а школу скончыла з залатым медалём. І сёння магу пахваліцца, яна — кандыдат эканамічных навук, намеснік дэкана БДЭУ.

**— Скажыце, а гендырэктар "Белбыта" вельмі пераборлівая і патрабавальная ў быце? Так бы мовіць, спадарыня з прэтэнзіяй?**

— Я не так доўга кірую "Белбытам". Раней узначальвала малочны завод, была старшынёй Салігорскага гарвыканкама. Але, нягледзячы на значнасць пасад, ніколі не была пераборлівай. Існуе сем смяротных грахоў, і адным з іх з'яўляецца гордасць. Мне не падабаецца, калі чалавек лічыць, што ён — самы-самы, што ў яго павінна быць усё лепшае, у тым ліку і ўмовы жыцця.

Я без прэтэнзій. Як і многія, карыстаюся амаль усімі паслугамі арганізацыі, якой кірую. Я стрыгуся і раблю ўкладку, напрыклад, у вучэбным цэнтры пры "Белбыце". І раблю гэта ў любога майстра, які вольны. Не думаю, што яны асабліва напружваюцца, калі абслугоўваюць мяне. Нічога такога з серыі *"Іванова — самы лепшы цырульнік і, значыць, я стрыгуся толькі ў яе"* няма.

**— Але ж складана Вас уявіць, напрыклад, у "камп'ютэрным класе", якія зараз паўсюдна адкрывае "Белбыт"...**

— Камп'ютэр у мяне ёсць на працы. Але я ўсё жыццё марыла аб асабістым. І вось на 50-годдзе, калі я яшчэ працавала ў Салігорскім гарвыканкаме, калегі здзейснілі маю мару і падарылі яго мне. Але ж не прайшло і паўгода, як давялося аддаць яго дачцэ. Так што дома ў мяне зараз камп'ютэра няма.

**— А праўда, што акрамя камп'ютэра, Вы падарылі дачцэ таксама і машыну?**

— Хлусіць нядобра, таму скажу праўду: напрыканцы 2006 года я купіла новы аўтамабіль у крэдыт і сапраўды падарыла яго дачцэ. У мяне ёсць службовая машына, а дачка на той час пасля разводу з мужам не паспявала спраўляцца з маленькім дзіцем і вялікай нагрузкай на працы. Крэдыт я аформіла на сябе, таму што ў мяне зарплата большая.

На мой погляд, дзеці змогуць жыць добра, калі ім будуць дапамагаць бацькі. Так і мае бацькі рабілі — давалі ўсё, што маглі, каб мы, трое дзяцей, вывучыліся і маглі чагосьці дасягнуць. І я раблю ўсё, каб дапамагчы сваёй дачцэ...

**Вольга ПРУДНІКАВА.**

## З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# Беларусы ў пустыні

*Днямі на сайце "Белорусских новостей" адбылася онлайн канферэнцыя з удзельнікамі беларускай каманды, якая брала ўдзел у прэстыжным ралі Лісабон—Дакар. Праўда, выступалі беларускія спартсмены ў складзе латвійскай каманды. Наш экіпаж — пілот Сяргей Шкель і штурман Аляксандр Інус — заняў 105-е месца ў абсалютным заліку. Гэта быў першы вопыт удзелу беларускай каманды ў падобных спаборніцтвах.*

*У канферэнцыі бралі ўдзел пілот Сяргей Шкель і механік нашай каманды Уладзімір Мотуз. Знаёмім чытачоў "Народнай волі" з самымі цікавымі адказамі.*

**— Чаму Вы выступалі ў складзе латвійскай каманды, а, да прыкладу, не ў расійскай?**

— Беларуская каманда існуе. Але, для таго каб стварыць паўнавартасную каманду, патрэбны сур'ёзныя спонсары ці падтрымка дзяржавы.

Мы выступалі ў складзе латышоў, таму што шмат гадоў сябруем з латвійскімі спартсменамі. Дарэчы, і машына "Оскар" была латвійскай вытворчасці. Гэты аўтамабіль спецыяльна выраблены для ўдзелу ў ралі-рэйдах у кампаніі "OSC" у горадзе Огрэ, што пад Рыгай. Ён распрацаваны канструктарам Андрысам Дамбісам.

**— Траса "Дакара" ідзе ў асноўным па пустынных тэрыторыях. Гэта азначае, што Вы пераадольвалі цаліну. Ці ўсё ж такі там была дарога? На што ўвогуле гэта было падобна?**

— Ёсць такія паняцці "спецучасткі" і "ліазон" (перагон). Дзень гонкі складаецца з ліазона да спецучастка. Спецучастак — гэта бездарожжа, пяскі, дзюны, саляныя азёры, камяні і гэтак далей. Увогуле, Сахара — гэта суцэльны пясок. Але там, канечне, дарогі ёсць. Праўда, яны не для ўдзельнікаў ралі.

**— У СМІ праходзіла інфармацыя, што падчас гонкі Вашу машыну літаральна цягнулі па аўтабане на буксіры. Пры гэтым адарванае кола было прывязана вяроўкай...**

— Ніхто нас не цягнуў. Па аўтабане мы рухаліся самі ў суправаджэнні паліцыі. Справа ў тым, што на другім, горным, этапе Парцімао—Малага ў машыне была пашкоджана цяга схаджэння левага задняга кола. Каб закончыць спецучастак і дабрацца да пункта тэхнічнай дапамогі, экіпаж з дапамогай падручных сродкаў забяспечыў некаторую працаздольнасць аўтамабілю. Прывязваць кола прыйшлося моцна...

**— Ці праўда, што Ватыкан патрабаваў забараніць "Дакар" як вельмі крывавыя спаборніцтвы. Што Вы пра гэта думаеце?**

— Сапраўды, Ватыкан ставіў такія патрабаванні. Але ў свеце шмат крывавых з'яў і без спорту. Так што ёсць дзе прыкласці намаганні.

**— Ці праўда, што ноччу ў пустыні мінусавыя тэмпературы? Як такія перапады вытрымлівала машына?**

— Перапады тэмпературы сапраўды вялікія. Напрыклад, у Маўрытаніі ў поўдзень было каля 40 градусаў па Цэльсіі, а наступнай ноччу — каля нуля. Але машыне, па вялікім рахунку, усё адно. Нават холад лепей.

**— Ці траляліся вам падчас гонкі караваны?**

— Не, караваны не трапляліся. Але дзікіх жывёл — вярблюдаў, ослікаў — мы бачылі шмат.

**— Ці атрымалі вы за ўдзел у ралі нейкія грошы? Што ўяўляе сабой галоўны прыз ралі?**

— Ніякіх грошай мы не атрымлівалі, толькі памятныя медалі. А галоўны прыз — гэта спецыяльная дошка, на якой выгравіраваны лагатып ралі. Увогуле, ніякіх грошай на ралі не заробіш. Толькі вопыт можна набыць.

**— І апошняе пытанне. Якія планы ў вашага экіпажа на будучыню?**

— Зараз чакаем пасяджэння дырэктараў "B&O" — нашага спонсара. Спадзяемся, што нам працягнуць фінансаванне на ўдзел у міжнародных спаборніцтвах, у тым ліку і ў новым "Дакары".

**Падрыхтаваў Антон ВІТАЛЬЕЎ.**

**Даведка.** Ралі "Дакар-2007" стартавала ў Лісабоне 6 студзеня. За два тыдні спаборніцтваў удзельнікі праехалі Іспанію, Марока, Маўрытанію, Малі. 21 студзеня адбыўся фініш у сталіцы Сенегала — Дакары. З 515 удзельнікаў, што стартавалі, да Дакара дабраўся 301.



## КУБАК ДЭВІСА

# *Владимир ВОЛЧКОВ: «Я не считаю шведов фаворитами в предстоящем матче»*



Второй номер белорусской сборной Владимир Волчков заявил, что не считает скандинавов фаворитами в матче 1/8 финала Кубка Дэвиса Беларусь—Швеция.

"В мировом командном рейтинге шведы нам уступают. А это отражение того, что происходило в течение последних лет. Мы доказали свое право участвовать в мировой группе, заставили с нами считаться ведущие теннисные державы. Да, многие думают, что в предстоящем матче шведы — фавориты, но я так не считаю. Мы сильны именно командным духом и готовы на домашнем корте дать соперникам настоящий бой и показать хороший теннис. Можете мне поверить: когда начинается первый сет, и ты подбрасываешь мяч для подачи, сразу забываешь о том, что писали в газетах и какие делались прогнозы. Перед тобой на другой половине корта соперник, которого ты должен, как бы это ни было трудно, обыграть", — заявил Волчков.

"Мне кажется, что мое физическое и эмоциональное состояние сейчас в полном порядке. Теперь за оставшиеся дни нужно сохранить все то, что наработал на тренировках, а в каких-то компонентах игры еще и добавить", — отметил второй номер белорусской сборной.

Касательно тренировочного сбора белорусской команды в Египте Волчков заявил: "В Египте все было по высшему разряду. Никогда не было еще, чтобы с четырьмя спортсменами в далекую страну поехали тренер по общефизической подготовке, два тренера и массажист".

# Корт новы — спартсмены старыя

***З 9 па 11 лютага Мінск зноў будзе прымаць кубак Дэвіса па тэнісе. У першым раўндзе сапернікамі нашых спартсменаў стануць шведы. На сённяшні дзень у неафіцыйным чэмпіянаце свету (менавіта так называюць Кубак Дэвіса) беларусы займаюць дзевяты радок, а скандынавы ідуць на дванаццатым месцы.***

Пакуль лідэр нашай зборнай Максім Мірны змагаўся на адкрытым чэмпіянаце Аўстраліі (дзе, дарэчы, прайграў у фінальных матчах парнага мужчынскага і змешанага разрадаў), у Мінску арганізатары матча Кубка Дэвіса ў шапку таксама не спалі.

У продаж былі аддадзены квіткі на матч беларусаў са шведамі. Кошт білетаў ад 30 да 100 тысяч беларускіх рублёў. Білеты можна набыць непасрэдна ў касах футбольнага манежа, а таксама ў распаўсюджвальнікаў. Такіх кропак у сталіцы шэсць: на станцыях метро "Кастрычніцкая", "Пушкінская", "Партызанская" і "Магілёўская", па праспекце Незалежнасці, 44, а таксама ў касах кінатэатра "Цэнтральны". Распаўсюджвальніца квіткоў на "Кастрычніцкай" расказала "Народнай волі", што пакуль білеты разыходзяцца слабавата: "Тое, што ўсе квіткі на тэніс будуць прададзены, я не сумняваюся. Праўда, купляюць пакуль толькі танныя — тыя, якія каштуюць ад 30 да 50 тысяч рублёў. Білеты набывае ў асноўным моладзь. А самыя дарагія білеты, як правіла, прадаюцца апошнімі. Пакупнікі, як дрэнныя студэнты, адкладваюць усё на самы апошні дзень. Праўда, тут ёсць рызыка ўвогуле на тэніс не трапіць".

У самім жа футбольным манежы ў апошнія дні студзеня скончылі класці новае пакрыццё тэніснага корта. Па патрабаванні міжнароднай тэніснай асацыяцыі "шчаслівае" для беларусаў пакрыццё прыйшлося замяніць. Справа ў тым, што пакрыццё "Тарафлекс" за два гады сапсавалася. І сапернікі нашай зборнай неаднойчы абскарджвалі свае пройгрышы, спасылаючыся на няякасць пакрыцця.

Нагадаем, што на старым пакрыцці было праведзена тры сустрэчы ў межах Кубка Дэвіса — з расіянамі, аргенцінцамі і іспанцамі. Ва ўсіх трох сустрэчах удача была на баку нашых спартсменаў. У сваю чаргу "пабітыя" сапернікі наракалі: хто на судзейства, а хто і на якасць пакрыцця. Беларускія тэнісныя спецыялісты тлумачаць замену пакрыцця наступным: маўляў, пры выкарыстанні пакрыццё робіцца больш тонкім, што павялічвае адскок мяча ад падлогі. Дарэчы, корт у мінскім футбольным манежы, дзе праходзяць тэнісныя матчы, і так лічыцца самым "хуткім" у свеце, таму і настаяла міжнародная тэнісная федэрацыя аб яго замене. Беларусы купілі новае пакрыццё, аднак яго вытворца той жа — "Тэрафлекс". Вядома, што новы корт ужо апрабаваў наш Уладзімір Валчкоў. Кажуць, што спартсмен быў задаволены...

Дарэчы, лідэры ў нашай зборнай які ўжо год запар адны і тыя ж. А менавіта — Макс Мірны і Уладзімір Валчкоў. Апошні яшчэ ў мінулым годзе казаў, што збіраецца завяршыць кар'еру. Аднак яго ўтрымлівае толькі адна акалічнасць — удзел зборнай Беларусі ў Кубку Дэвіса.

У складзе шведаў лідэр таксама вядомы — гэта Ёнас Б'ёркман. Швед — партнёр Максіма Мірнага па выступленнях на міжнародных спаборніцтвах у парным разрадзе. Спартсмены сябруюць, ведаюць адзін пра аднаго літаральна ўсё. І нават свайго сына шведскі тэнісіст назваў Максам. На камандным узроўні Мірны і Б'ёркман сустрэнуцца ўпершыню, што называецца, па розныя бакі барыкад. Такое яно, спартыўнае жыццё.

Капітан зборнай Беларусі па тэнісе Дзмітрый Татур назваў склад каманды на матч Кубка Дэвіса "Беларусь—Швецыя", які пройдзе з 9 па 11 лютага ў Мінску.

У спісе 4 тэнісісты. Пад першым і другім нумарамі традыцыйна заяўлены Максім Мірны і Уладзімір Валчкоў. Кампанію ім складуць маладыя Павел Катляроў і Сяргей Тарасевіч. Аднак, па словах капітана, у складзе могуць быць змены.

**Віталь ГАРБУЗАЎ.**

## ШАШКІ

### Памяці Андрушчанкава



Наш пастаянны аўтар пінчук Аляксандр КАГОЦЬКА — нацыянальны майстар спорту, чэмпіён краіны па шашачнай кампазіцыі. Пазнаёмцеся з яго новым творам:

**Белыя:** c5, d4, e5, f2, f4, h2, h6 (7).

**Чорныя:** a5, a7, c7, d2, e7, h4, h8 (7).

Таго, хто адшукае перамогу за белых, чакае сюрпрыз ад аўтара — кніга на шашачную тэму. Міні-конкурс прысвячаецца светлай памяці яго земляка Мікалая Іванавіча Андрушчанкава (1929—2006) — майстра спорту СССР, дапытлівага аналітыка і таму першакласнага рашальніка.

Разгледзьце яшчэ некалькі задумак А.Кагоцькі на 64-клетачнай дошцы:

**1.Белыя:** дамкі c1, g1 (2). **Чорныя:** c3, g7, h6 (3). Ge3 (d2A) g5x. A(f6) f4 (e5, g5, b2) e5x.

**2.Белыя:** g7, дамкі e7, h6 (3). **Чорныя:** c3, дамка c1 (2). Gh8 (c3-d2A) c3, a3x. A(a3) b2 (f8B) a3x. B(c1) a3x.

**3.Белыя:** g5, дамкі e1, f2, h4 (4). **Чорныя:** g3, дамкі a5, d8 (3). F6, d8 (c3A) a5, h4x. A(h2) g1x.

**4.Белыя:** d2, дамка e1 (2). **Чорныя:** b4, b6, d4, e5, e7, f4 (6). C3 (b2A) a3x. A(d2) c5x.

"Турэцкі" ўдар.

**5.Белыя:** e7, дамка f8 (2). **Чорныя:** c5, d4, d6, h4 (4). D8 (g3/e3/c3) b6x. 1 ... e5 2. b4 f4 3. b6 fe3 4. a7 g3 5. bc5x.

**6.Белыя:** a3, c5, e3 (3). **Чорныя:** b4, c7, e5 (3). Практычная пазіцыя. Знайдзіце ў ёй перавагу за белых самастойна. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

Тэрмін для адказаў — традыцыйныя два тыдні. Чакаем іх па адрасе: **220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а, рэдакцыя газеты "Народная воля", "Шашкі".**

### У гонар юбілею газеты

У Мінску ладзіўся турнір пад назвай "Нашай Ніве" — сто гадоў". Ён быў арганізаваны па ініцыятыве вядучага шашачнай шахматнай рубрыкі газеты, кандыдата ў майстры спорту Вольфа Рубінчыка, кіраўніка мар'інагорскага клуба "Дэбют", майстра спорту Канстанціна Балахоўскага і іншых. Галоўны суддзя Аляксандр Паўловіч запрасіў да шашачных столікаў 11-й сталічнай спартшколы 48 ігракоў. Балельшчыкі прыйшлі паглядзець не толькі на гульню заслужанага майстра Рэспублікі Беларусь Аркадзя Плакхіна, але і на баталіі тых, хто яшчэ зусім нядаўна пазнаў "трохкутнік Пятрова". Наведаў святочную залу спаборніцтваў і чэмпіён свету 2005 года, міжнародны грасмайстар Андрэй Валюк (Гродна). Ад імя рэдакцыі газеты прывітаў усіх прысутных Андрэй Скурко.

Прызёрамі сталі майстар Кірыл Хайнюк, міжнародны грасмайстар Аркадзь Плакхін і майстар Юрый Файнберг. Ім уручаны медалі, яны і яшчэ сем пераможцаў атрымалі дыпломы, блакноты для запісу партый. Сувенірамі з сімволікай "НН" адзначаны 7-гадовы сын неаднаразовай чэмпіёнкі Беларусі Марыны Разаевай з Віцебска Валерый і 70-гадовы маэстра Юрый Файнберг, аўтар наступнай лепшай камбінацыі Дзмітрый Фадзееў:

**Белыя:** (М.Пякарскі): a5, c1, d4, e1, f2, f4, h2, h4 (8). **Чорныя:** (Д.Фадзееў): a3, b6, b8, c7, d6, e7, f6, g7, h6 (9). 1 ... hg5 2. f:f8 dc5 3. f:b4 a:g1x. Эфектны ўдар "пяткай".

### Майстарская камбінацыя

Аб выніках чэмпіянату краіны ў першай лізе мы ўжо павед дамлялі. Сёння прыводзім фрагменты з гэтага спаборніцтва:

**1.Белыя** (А.Майсееў): 27, 28, 30, 32, 35, 37, 38, 42, 43, 45, 48 (11). **Чорныя** (І.Пашкевіч): 3, 6, 11, 12, 13, 15, 18, 19, 23, 24, 26 (11). 1. 2722 2. 32:21 23:41 (збіваць большасць фігур абавязкова) 3. 2117 4. 4237 5. 38:7х. Удар Шпрынгера.

**2.Белыя:** (Е.Шпакава): 16, 28, 29, 33, 35, 36, 38, 39, 41, 42, 43, 44, 45, 46, 48, 49 (16). **Чорныя** (Н.Гарэлая): 2, 3. 4, 5, 6, 7, 8, 9, 12, 13, 15, 17, 18, 20, 25, 26 (16). 1 ... 2631 2 ... 1722 3 ... 12:32 4 ... 2530 5 ... 1823 6 ... 20:36х. Элементарны спосаб для дасягнення перавагі ў партыі.

**3.Белыя** (Д.Фадзееў): 29, 32, 34, 35, 36, 37, 39, 40, 42, 43, 50 (11). **Чорныя** (І.Міхальчанка): 7, 9, 12, 13, 15, 16, 18, 19, 20, 25, 26 (11). 1 ... 1924 2. 5044 3. 39:28 2530! 4. 34:3 1217 5. 3:21 16:49х. А гэта ўжо майстарская камбінацыя.

### Коратка кажучы

Украінка Дар'я Ткачэнка захавала сваё званне чэмпіёнкі свету па шашках-100, перайграўшы прэтэндэнтку на шашачную карону Тамару Тансыкужыну (Расія).

***

Званне чэмпіёна свету па шашках-64 (сучасная версія) прысуджана расіяніну Мікалаю Стручкову.

***

Чэмпіянат Еўропы па шашках-100 сярод ветэранаў выйграў Лайманіс Заліціс (Латвія).

***

У галандскім горадзе Байлмер адбыўся прэстыжны міжнародны турнір. Перамог у ім экс-чэмпіён свету масквіч Аляксандр Шварцман.

***

У першынстве Малдовы (сучасная версія — "лятаючыя" шашкі-64) мацнейшымі былі грасмайстар Іон Даска (мужчыны) і Юлія Раманская (жанчыны).

**Мікалай ГЛАДКІ.**

## ШАХМАТЫ

### Задача-лауреат
*В.Фигин*



**Белые:** Крb6, Фf1, Кb5, Кg3 (4).

**Черные:** Крd5, пп.d4, e7 (3).

**Мат в 2 хода.**

Предлагаем вниманию читателей двухходовую задачу-миниатюру могилевского проблемиста Валерия Фригина, которая была отмечена призом на конкурсе составления шахматных композиций. Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная воля", "Шахматы".**

### Сверьте решения

**Задачи-близнецы Вадима Жилко** (опубликованы 1 декабря): №1-1. Фh1!

1...Крf2 2.Фh2+ Крf3 3.Крe5 Крg4 4.Фf4х, 2...Крf1 3.Кd4 Крe1 4.Фe2х 1...h2 2.Кd4 Крf2 3.Фf3+ Крg1 4.Кe2х, 2...h3 3.Фf3+ Крh4 4.Фf2х.

№2: 1.Крe3! 1...Крg4 2.Фf8 h2 3.Фf4+ Крh3 4.Фf3х, 2...Крg5 3.Фg7+ Крf5 4.Кd4х, 2...Крg3 3.Фf2+ Крg4 4.Фf4х.

1...Крh2 2.Фg8 Крh1 3.Крf2 и 4.Фg1х.

**Композиция Э.Делалио** ("Народная воля" за 8.12.): 1.Сh4!

### Победа далась нелегко

В Минске прошел 73-й чемпионат страны по шахматам среди мужчин (высшая лига). Борьбу за титул чемпиона и призовые места вели 12 сильнейших спортсменов. Соревнования проводились по круговой системе. Уже с первых туров на чемпионате развернулась острейшая борьба. Не обошлось и без неожиданностей. К ним можно отнести неудачный старт рейтингового фаворита гроссмейстера Алексея Александрова. В первом туре он потерпел поражение во встрече с гроссмейстером Вячеславом Дыдышкой, а во втором вынужден был, играя белыми, довольствоваться ничьей в партии с Юрием Тихоновым. Однако в дальнейшем фаворит резко усилил игру. Исход соперничества решился на финише. Набрав в заключительных 5 турах 4 очка, Александров сумел опередить всех конкурентов и в третий раз завоевать золотую медаль чемпиона Беларуси. Результат победителя — 7,5 очка из 11 возможных. Серебряным призером стал молодой мастер из Новополоцка Виталий Тетерев, отставший от чемпиона на одно очко. С таким же результатом бронзовую медаль завоевал самый молодой участник, чемпион Европы среди юношей до 18 лет 2006 года международный мастер Сергей Жигалко. Вровень с ним стал и мастер спорта Сергей Михайловский, но по коэффициенту ему было присуждено лишь четвертое место. Следует отметить успех молодого минчанина, кандидата в мастера Павла Ломако. Набрав 6 очков, он занял пятое место. А главное, выполнил норму международного мастера. По 5,5 очка набрали международный мастер Никита Майоров, гроссмейстеры Вячеслав Дыдышко, Андрей Жигалко и Юрий Тихонов, разделившие 6—9-е места. За ними следуют: 10.международный мастер Дмитрий Новицкий — 5 очков, кандидаты в мастера 11.Евгений Подольченко — 4,5, 12.Владимир Кущенков — 1,5 (все из Минска).

Приводим одну из партий победителя чемпионата, имевшую важное значение для итогов турнира.

### Н.Майоров — А.Александров
### Защита Нимцовича

1.d4 d5 2.c4 e6 3.Кf3 Кf6 4.Кc3 Сb4 5.cd ed 6.Фa4+ Кc6 7.Сg5 h6 8.С:f6 Ф:f6 9.e3 o-o 10.Сe2 Сe6 11.o-o a6 12.Лfc1 Сd6 13.Фd1 Кe7 14.a3 b6 15.Фf1 Сg4 16.b4 c6 17.Кa4 Лfb8 18.h3 Сf5 19.Фe1 g5 20.Кb2 h5 21.Кd3 g4 22.hg С:d3 23.С:d3 hg 24.Кd2 a5 25.ba Л:a5 26.a4 Лba8 27.g3 Крg7 28.Фe2 Фg5 29.Сc2 Фh5 30.Фd3 Лh8 31.Крf1 С:g3! 32.Крe2 С:f2! 33.Лh1 Сh4 34.Лag1 g3+ 35.Кf3 Фg4 36.Фa3 c5 37.Фc3 Лh6 38.Фe1 (38.dc+ Лf6!) Крf8 39.Фf1 cd 40.Фh3 d3+ 41.С:d3 Л:a4 42.Ф:g4 Л:g4 43.Л:h4 Лh:h4 44.К:h4 Л:h4 45.Л:g3 Лh2+ 46.Крf3 Кc6+ 47.Лg5 Кb4 48.Сb5 Крe7 49.Лg4 Кc2 50.Лg8 Лh3+ 51.Крf4 Лh4+ 52.Крg5 Лh2 53.Лe8+ Крd6 54.Сd3 Лg2+ 55.Крf6 Лf2+ 56.Сf5 d4 57.Лd8+ Крc5 58.e4 Кe3 59.Крe5 Кc4+ 60.Крf6 Кd6 61.Крe5 Кb5 62.Л:d5+ Крc4 63.Лd7 d3 64.Л:f7 d2 65.Лd7 Кc3 66.Сe6+ Крb4 67.Сg4 b5 68.Крe6 Лf4 69.e5 Л:g4 70.Л:d2 Крc4 71.Крf5 Лd4 72.Лc2 Лd1 73.e6 Лe1 74.Лd2 b4. **Белые сдались.**

### Табель о рангах
### Рейтинги белорусских шахматисток

В рейтинг-лист Международной шахматной федерации (ФИДЕ) включены 393 белорусских шахматиста. В том числе более 60 шахматисток. Наибольший рейтинг имеет брестчанка, двухкратная чемпионка республики, международный гроссмейстер Анна Шаревич — 2325. В первую десятку среди женщин также входят: 2.международный гроссмейстер Инна Романова (Минск) — 2272, 3.международный мастер Надежда Азарова (Минск) — 2244, 4.чемпионка Беларуси 2006 года международный мастер Наталья Попова (Минск) — 2233, 5.мастер спорта Татьяна Каспарова (Могилев) — 2224, 6.международный мастер Татьяна Берлин (Брест) — 2218, 7.международный гроссмейстер Генриетта Лагвилава (Минск) — 2205, 8.мастер спорта Татьяна Бондарь (Минск) — 2190, 9.международный гроссмейстер Раиса Эйдельсон (Витебск) — 2181, 10.международный гроссмейстер Ольга Герасимович (Минск) — 2177.

## ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

# «Не, без "Народнай волі" не магу...»

Да такой высновы прыйшлі многія з тых чытачоў, хто не зрабіў **перадаплату** за лютаўскія нумары і ўжо на мінулым тыдні не атрымаў першыя з іх. Што ж, даражэнькія, каб у далейшым мець пад рукамі сваю любімую газету, Вам трэба ўсё ж у самыя бліжэйшыя дні знайсці сродкі і па-новаму аформіць **перадаплату.** Дзеля гэтага мы і друкуем сёння ўзоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Для тых, хто толькі-толькі вырашыў стаць чытачом "Народнай волі", паведамляем: каб зрабіць **перадаплату** за нумары наступных месяцаў (можна нават да канца паўгоддзя), **тэрмінова** наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры з новымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індыві-дуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, установ, фірм (за два месяцы адпаведна 19.000 і 30.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

**УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.**

У чарговы раз звяртаем увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

**Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!**

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Предоплата за февраль, март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть) | | | | |
| Плательщик | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Предоплата за февраль, март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть) | | | | |
| Плательщик | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов.

**Абонентская карточка**
*на номера газеты «Народная воля»*
**за февраль, март, апрель, май, июнь 2007 года**
*(ненужное зачеркнуть)*

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия
имя ____ отч.
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
*город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)*
улица
пр-т
переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом ____ *а,б,в,г* корп. ____ кв. ____

*(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)*

## ПОЗДРАВЛЕНИЯ

*10 февраля мой брат Алексей Сацевич сочетается законным браком с любимой девушкой Анастасией. Хочу пожелать им долгой, счастливой совместной жизни, крепкого здоровья и успехов!*

**Николай САЦЕВИЧ.**

*Групе навучэнцаў 11-га класа (10 чалавек), якія самастойна вывучаюць праграму сярэдняй агульнаадукацыйнай школы, патрабуюцца настаўнікі для кансультацый і падрыхтоўкі да іспытаў па наступных прадметах: **гісторыя Беларусі, біялогія, англійская і руская мовы.***

**Тэл.: 226-61-01, 215-31-69, 342-90-80.**

**Адрас рэдакцыі:**
**220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.**
**Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.**
**Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.**
**E-mail : nv@promedia.by**
**http://www.nv-online.info**
**Індэкс 63222**

**Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ**

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.

Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54.Падпісаны ў друк 7.02.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №